

**Не кладзіце грошы ў дакументы**

СТАР. 3



**Калі паводка на карысць**

СТАР. 3



**Сустрэць палавінку на балі**

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 лютага 2016 г. СЕРАДА № 20 (28130) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# НА БЕРАГАХ ДНЯПРА І ДРУЦІ

**Дзень беларускага пісьменства пройдзе 4 верасня ў Рагачове Гомельскай вобласці. Гэта прадугледжана адпаведнай пастановай Савета Міністраў, паведамілі ў прэс-службе беларускага ўрада.**



Для падрыхтоўкі і правядзення свята ствараецца нацыянальны арганізацыйны камітэт. Яго ўзначаліць віцэ-прэм'ер Наталля Качанава. Фінансаванне падрыхтоўкі і правядзення мерапрыемстваў Дня пісьменства даручана ажыццявіць за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў са сродкаў, прадугледжаных на правядзенне цэнтралізаваных мерапрыемстваў, а таксама іншых крыніц.

Дзень беларускага пісьменства — нацыянальнае свята. Адзначаецца з 1994 года і праводзіцца з мэтай прапаганды найлепшых традыцый нацыянальнай культуры, друкаванага слова, духоўнасці беларускага народа. Праводзіцца ў гістарычных і культурных цэнтрах, з якімі непарыўна звязана жыццё вядомых дзеячаў краіны.

# ВАЛОСАВІЦКІ ВАЛЬС



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Некалі на Чачэршчыне асабліва папулярнай была адмысловая мясцовая мелодыя — «Валосавіцкі вальс», якая, кажуць, нарадзілася ў вёсцы Валосавічы. Яе жыхары Уладзімір КАНЦАВЫ і Павел КЛІМЯНКОЎ, былыя аграном і вадзіцель, — два вясковыя гарманісты. Яны жаданыя госці на кожным свяце, але часам збіраюцца проста пайграць для душы, у тым ліку — і той самы родны сэрцу вальс...**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Міхаіл МІХАДЗЮК, намеснік міністра энергетыкі:**
*«Стварэнне атамнай энергетыкі — гэта новы якасны інтэлектуальны і тэхналагічны імпульс у развіцці краіны і забеспячэнне дадатковых гарантый умацавання дзяржаўнай незалежнасці і эканамічнай бяспекі краіны. Нагадаю, што АЭС дасць магчымасць штогод замяшчаць каля 5 млрд куб. м прыроднага газу. Гэта знізіць выкіды парніковых газаў у атмасферу на 7-10 млн т у год. Паменшыцца сабекошт выробленай у краіне электраэнергіі. Прыняцце дзяржавай рашэння аб развіцці ядзернай энергетыкі грунтуецца на абавязацельстве бяспечнага і надзейнага выкарыстання ядзернай энергіі ў мірных мэтах».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.02.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 21568,00 | ▲ |
| Еўра | 23505,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 276,17 | ▲ |
| Укр. грыўня | 845,54 | ▲ |

■ ЗаконаТворчасць

# ДАЙСЦІ ДА КОЖНАГА

## Дэпутаты працуюць над зменамі і дапаўненнямі ў Закон «Аб перапісе насельніцтва»

**Здавалася б, зусім нядаўна ў нас ужо праходзіў перапіс: нехта запоўніў анкеты на працы, да некага валанцёры прыходзілі дадому. Аднак ужо сёння ідзе падрыхтоўка да наступнага — у 2019 годзе мы зноў пройдзем праз гэту працэдуру. У Палату прадстаўнікоў паступіў дакумент, які прадугледжвае ўнясенне шэрагу змен і дапаўненняў у Закон «Аб перапісе насельніцтва». Там улічаны праблемы, з якімі сутыкнуліся мясцовыя структуры, самі перапісчыкі ў 2009 годзе.**

Дэпутат **Ілья Мурашка, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах**, спецыяльна для нашага выдання расказаў, якія прапануюцца змены ў законапраект.

— Падчас падрыхтоўкі да правядзення перапісу насельніцтва ў 2009 годзе быў выяўлены шэраг праблем, што ўскладняюць разуменне нормаў закона, — паведаміў дэпутат. — Гэта і рознае разуменне дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі прадпісанняў закона падчас перапісу насельніцтва, і вызначэнне парадку і крыніц аплаты працы часовага персаналу, які задзейнічаны ў перапісе насельніцтва...

Новая рэдакцыя закона прадугледжвае ўдакладненне асобных тэрмінаў і іх азначэнняў. Так, тэрмін «перапіс насельніцтва» ўдакладнены ў адпаведнасці з новай рэдакцыяй Закона «Аб дзяржаўнай статыстыцы». Зменены таксама азначэнні тэрмінаў «перапісны ліст», «выніковыя даныя», «абязлічаныя персанальныя даныя».

— Мы павінны разумець, што карэкціроўка Закона «Аб перапісе насельніцтва» звязана і з тым, што ў некаторыя заканадаўчыя акты, цесна звязаныя з гэтым праектам закона, унесены пэўныя змены, — патлумачыў Ілья Мурашка.

### ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПОЎНЫ АХОП НАСЕЛЬНІЦТВА

Да істотных праблем, якія плануецца вырашыць зменамі спецыялізаванага закона, адносіцца, безумоўна, той факт, што ў 2009 годзе па-за сферай заканадаўчага рэгулявання аб правядзенні перапісу апынуліся асобныя катэгорыі насельніцтва.

— У прыватнасці, гэта асобы, што навучаліся ў суворАўскіх, кадэцкіх вучылішчах, спецыялізаваных ліцэях, а таксама выхаванцы воінскіх часцей, — пералічыў суразмоўца. — У Кодэкс аб адукацыі былі ўнесены змены, на аснове якіх прадугледжваюцца адпаведныя дапаўненні і ў новую рэдакцыю Закона «Аб перапісе насельніцтва» — вызначаецца парадак правядзення перапісу гэтых катэгорый асоб.

СТАР. 2

■ Падаткі

# ПАДЛІЧЫЦЬ І РАЗЛІЧЫЦЦА

## Падсумаваць даходы за год трэба да першых дзён вясны, а заплаціць падаткі — да 15 мая

**Пэўная частка падаткаплацельшчыкаў нашай краіны павінна сёлета да 1 сакавіка падаць у падатковыя органы дэкларацыю аб даходах за мінулы год. Тут трэба адразу адзначыць, што далёка не ўсе абавязаны наведваць падатковую інспекцыю. Па-першае, дэкларацыі запаўняюць толькі падатковыя рэзідэнты нашай краіны. А гэта фізічныя асобы, якія фактычна знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі больш за 183 дні ў каляндарным годзе. Па-другое, у частцы плацельшчыкаў існуе толькі права падаць такую дэкларацыю, каб потым атрымаць падатковы вылік. Але ёсць і тыя, хто павінен абавязкова «пасябраваць» з падатковай дэкларацыяй. Для апошніх мы сумесна са спецыялістамі прэс-службы Міністэрства па падатках і зборах (МПЗ) Беларусі падрыхтавалі падрабязны тлумачальнік.**



### Другі «легкавік» і першы аўтобус

Да вясны абавязкова падаць дэкларацыю павінны тыя людзі, якія за мінулы год прадалі больш як адзін аўтамабіль, тэхнічна дапушчальная агульная маса якога не перавышае 3500 кг і колькасць сядзячых месцаў у ім, акрамя сядзення кіроўцы, не перавышае васьмі. Абавязак на дэклараванне пачынаецца пасля продажу ўжо аднаго грузавога аўтамабіля ці аўтобуса, калі ў першага агульная маса перавышае 3500 кг, а ў другога колькасць месцаў перавышае восем.

Тут спецыялісты МПЗ удакладнілі, што, калі машына, якую вы прадалі, дасталася вам у спадчыну, падатак плаціць не трэба незалежна ад перыядычнасці адчужэння транспартных сродкаў на працягу каляндарнага года.

### Ліміт на адчужэнне нерухомасці

Запаўняць дэкларацыю па выніках года павінны тыя, хто на працягу 5 апошніх гадоў прадаў іншым фізічным асобам другую кватэру ці другі жылы дом, больш за адзін садовы домік, больш за адзін гараж (зямельны ўчастак, машына-месца), якія належаць фізічнай асобе на праве ўласнасці. Тут эксперты міністэрства ўдакладняюць, што пры атрыманні на працягу 2011—2015 гадоў даходаў ад продажу аднаго наймення аб'екта нерухомасці (напрыклад, у 2011 годзе — адной кватэры, а ў 2015 годзе — аднаго жылога дома) фізічная асоба вызваляецца ад падачы падатковай дэкларацыі (разліку), бо такія даходы вызваляюцца ад падаходнага падатку.

СТАР. 3

■ Дзеці адной зямлі

# САМАБЫТНАСЦЬ У АДЗІНЫМ ЦЭЛЫМ

## XI Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур пройдзе ў Гродне 4-5 чэрвеня

**Пра гэта паведаміў Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леанід ГУЛЯКА. Ён адзначыў, што нядаўна пад кіраўніцтвам намесніка прэм'ер-міністра Наталлі КАЧАНАВАЙ адбылося пасяджэнне аргкамітэта па правядзенні гэтага свята. Сёлета яно збярэ каля 800 удзельнікаў. Ужо прайшлі адборы ва ўсіх абласных гарадах і ў беларускай сталіцы.**

### ПАТРЭБНЫ АЙЧЫННЫЯ РЭСТАЎРАТАРЫ

На пасяджэнні калегіі апарату Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў абмяркоўваліся і іншыя тэмы. Наталля Качанава, якая прысутнічала на калегіі, звярнула ўвагу на тое, што на рэстаўрацыю айчынных аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны з дзяржаўнага бюджэту выдзяляюцца досыць істотныя сродкі. Аднак часта для выканання адпаведных работ у нас не хапае дасведчаных рэстаўратараў. «Мы вымушаны запрашаць спецыялістаў з іншых краін, — заўважыла віцэ-прэм'ер. — Але мы павінны мець спецыялістаў рознага ўзроўню, падрыхтаваных самастойна, якія і будуць працаваць на гэтых аб'ектах».

Нават калі няма айчыннай рэстаўратарскай школы, неабходна накіроўваць выпускнікоў Акадэміі мастацтваў, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, іншых устаноў для пераймання вопыту замежных калег, лічыць віцэ-прэм'ер.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Еўропе прадраклі велізарныя паводкі



Значныя тэрыторыі Заходняй, Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў выпадку, калі чалавецтва не прыме неабходных захадаў, праз 30-70 гадоў будуць знаходзіцца пад пагрозай затаплення з-за глабальнага пацяплення. Такі прагноз змяшчаецца ў дакладзе Еўрапейскага агенцтва па навакольным асяроддзі. Кліматолагі мяркуюць, што да 2050 года эканамічны ўрон ад паводак узрасце ў пяць разоў, а да 2080-га — у 17. Сярод тэрыторый, якія знаходзяцца пад пагрозай, называюцца нізінныя раёны, размешчаныя ў далінах буйных рэк (перш за ўсё Рэйна і Дуная). У перыяд паміж 1980 і 2010 гадамі ў 37 еўрапейскіх краінах было зарэгістравана 3563 паводкі. Найбольшая колькасць бедстваў адбылася ў 2010-м (321 паводка ў 21 краіне). Больш за ўсё пацярпелых было ў Італіі (6,7 мільёна чалавек), а больш за ўсіх пацярпела Венгрыя (18 працэнтаў плошчы, 1,8 мільёна чалавек).

### Польшча адновіць расследаванне авіякатастрофы пад Смаленскам

Польшча адновіць расследаванне крушэння пад Смаленскам самалёта «Ту-154» 10 красавіка 2010 г., у якім загінуў прэзідэнт Лех Качыньскі, паведамляюць інфармагенцтвы. Хутчэй за ўсё, спецыяльная камісія будзе склікана на гэтым тыдні міністрам абароны. Польскія і замежныя эксперты правядуць расследаванне зноўку — ад моманту рамонту самалёта да яго крушэння. Адной з прычын авіякрушэння раней называліся памылкі пілотаў.

### Папа Рымскі здымецца ў прыгодніцкім фільме

Папа Рымскі Францішак паўдзельнічае ў здымках фільма. У Ватыкане адзначаюць, што пантыфік даў згоду на ўдзел у здымках сямейнай прыгодніцкай дзіцячай карціны пад назвай «Па той бок сонца» ў ролі самога сябе. Гэта гісторыя пра тое, як дзеці розных культур шукаюць Ісуса. Здымкі стартуюць у другой палове 2016 года, прыбытак ад карціны аддадуць на дабрачыннасць для радзімы Папы — Аргенціны. Кіраўнік Каталіцкай Царквы ў напісанне сцэнарыя не ўмешваўся, папрасіў толькі, каб фільм быў як мага больш зразумелы моладзі.



ISSN 1990 - 763X

16020>

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Яблыкі знізяць халестэрын

Статыны — магутны сродак, які зніжае ўзровень халестэрыну. Аднак яны маюць сур'ёзныя пабочныя эфекты. Як адзначае The Telegraph, статыны можна замяніць яблыкамі, прынамсі ў некаторых выпадках. Калі ў дзень з'ядаць па яблыку, то, магчыма, рэальна прадухіліць сардэчныя прыступы і інсульты, кажуць эксперты Універсітэта Ліверпуля. Па даных навукоўцаў, для людзей, якія знаходзяцца ў групе адносна паніжанай рызыкі развіцця сардэчна-сасудзістых адхіленняў, штодзённае спажыванне яблыкаў можа быць эквівалентным зніжэнню рызыкі інфаркту міякарда за кошт прыёму статынаў. Пра перспектыўнасць агучанага падыходу сведчыць той факт, што больш за 80% усіх выпадкаў сардэчна-сасудзістых захворванняў звязана з вонкавымі фактарамі. У прыватнасці, гаворка ідзе пра шкодную ежу, курэнне, алкаголь і адсутнасць фізічнай актыўнасці.



КОРАТКА

Павялічаны памеры ставак утылізацыйнага збору адносна транспартных сродкаў. Адпаведнае рашэнне змешчана ў пастанове Савета Міністраў № 74 ад 30 студзеня 2016 года. Павелічэнне склала: для юрыдычных асоб у 1,65 раза і фізічных асоб у 8,25 раза. Гэта з'яўляецца адной з мер па ўрэгуляванні ўвозу транспартных сродкаў з дзяржаў — членаў ЕАЭС.

**Больш як Br890 млрд са сродкаў дзяржпошліны за допуск транспартных сродкаў да ўдзелу ў дарожным руху накіравана ў 2015 годзе на будаўніцтва рэспубліканскіх аўтадарог.**

На рынку працы Беларусі занадта многа эканамістаў, у дэфіцыце — медыкі.

**Першыя вясеннія птушкі заўважаны ў Гродзенскай вобласці. У Бераставіцкім раёне арнітолагі заўважылі некалькі дзікіх гусей. Звычайна першыя птушкі гэтага віду ў нашых краях з'яўляюцца ў канцы лютага.**

Варатар мінскага «Дынама» Джэф Глас прызнаны лепшым галкіперам у КХЛ на мінулым тыдні.

# ЯК ПАТУШЫЦЬ ПАЖАР САМОМУ?

Сумесны праект „Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

## Аналізуем розныя бытавыя сітуацыі

**Усе мы ведаем, што пры пажары трэба тут жа тэлефанаваць па нумары 101. Аднак супрацоўнікі МНС не чараўнікі і імгненна з'явіцца на месцы падзей не могуць. А за той час, пакуль яны будуць ехаць, шмат можна паспець зрабіць і самому, каб адстаяць у ненажэрнага полымя свае жытло і маёмасць. Як і што трэба рабіць? Аб гэтым карэспандэнт «Звязды» распытаў <u>начальніка ўпраўлення аварыйна-выратавальных службаў і ліквідацыі надзвычайных сітуацый МНС Юрыя МЯТЛІЦКАГА.</u>**



### ПРАВЕРКА ЛІШНЯЙ НЕ БЫВАЕ

Галоўны вораг падчас пажару — гэта паніка. Таму змагацца з агнём трэба максімальна спакойна і вытрымана.

— Як правіла, любы пажар пачынаецца з нязначнай крыніцы. Затушыць яго ў гэты перыяд лягчэй за ўсё. Галоўнае — тут жа абясточыць дом і адшукаць месца ўзгарання. Лепшым памочнікам для другога дзеяння стане аўтаномны пажарны апавяшчальнік. У сучасных дамах куды больш небяспечны атрутны дым, які ўтвараецца з-за тлення матэрыялаў з сінтэтычных рэчываў.

Без кіслароду полымя распаўсюджвацца не можа. Таму неабходна перакрыць доступ свежага паветра. У прыватных дамах нярэдка пажар імкліва разыходзіцца па вентыляцыйных каналах і з-за расчыненых дзвярэй і люкаў ці разбітых вокнаў на гарышчы. У апошнім выпадку пагроза павелічэнне плошчы пажару становіцца яшчэ большай з-за таго, што адкрытае полымя заўжды перакідваецца ў верхнюю частку жылога дома з-за прысутнасці натуральнай цягі паветра. Таму адчыняць дзверы з пакоя, які гарыць, у іншыя памяшканні і разбіваць шкло ў рамах трэба толькі ў крайнім выпадку, калі неабходна ратаваць людзей.

СТАР. 6

■ Парламенцкі дзённік

# «ІНТЭГРАЛ» ПАПРАВІЎ ЗДАРОЎЕ

**Сёння «Інтэграл» — адно з тых прадпрыемстваў, якое апраўдала дзяржаўны грашовы ўклад на мадэрнізацыю вытворчасці. Так лічыць Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, які сустрэўся з працоўным калектывам кампаніі, а таксама падзяліўся поглядам на тое, як мусіць развівацца беларуская вытворчасць, ці варта падтрымліваць стратныя гаспадаркі, і даў свой прагноз, калі ажыве сусветная эканоміка.**

## Вынікі дапамогі

«Мы бачым, што мадэрнізацыя дала свае вынікі. Прадпрыемства цалкам разлічылася па крэдыце, які быў яму прадастаўлены, а таксама павялічыла аб'ём вытворчасці і выручкі», — кажа ён. Так, аб'ём вытворчасці «Інтэграла» за мінулы год перавысіў паўтара трыльёна беларускіх рублёў, а аб'ём экспарту склаў 83,5 мільёна долараў. Прадпрыемства працуе на знешнія рынкі, не толькі на Расійскую Федэрацыю, але і на Паўднёвую Карэю ды шэраг іншых краін з развітымі тэхналогіямі.

Міхаіл Мясніковіч упэўнены, што дзяржаўная падтрымка ў гэтым выпадку цалкам апраўдалася: «Дзяржава дала «Інтэгралу» магчымасць атрымаць крэдыт у памеры 30 мільёнаў еўра. Гадавы аб'ём выручкі ў два разы большы за яго! Адзінае, былі трохі зменшаны працэнты па крэдыце, бо так склалася фінансавая сістэма, што крэдыты цяпер досыць дарагія, і трэба было дапамагчы прадпрыемству абслужыць яго, з чым яно паспяхова справілася. Гэта яшчэ адно пацвярджэнне, што мадэрнізацыяй і тэхнічным пераўзбраеннем трэба займацца пастаянна».

Міхаіл Мясніковіч асобна спыніўся на Дырэктыве №3 «Аб прыярытэтных кірунках умацавання эканамічнай бяспекі дзяржавы», якая, перш за ўсё, скіравана на эканомію, і асабліва — энерганосьбітаў. Нягледзячы на пастаяннае зніжэнне энергаёмістасці валавога ўнутранага прадукту, усё ж трэба дабівацца таго, каб энергаспажыванне было ніжэйшым. Але гэты падыход павінен быць апраўданым і разумным.

— 70% беларускага імпарту — гэта прамежкавыя тавары, якія мы набываем, каб пасля апрацаваць і стварыць канчатковую прадукцыю, — патлумачыў спікер. — А з гэтага палова — прамыя энерганосьбіты. Мы набываем у Расійскай Федэрацыі каля 23 мільёнаў тон нафты за год, менш паловы ідзе на ўнутраны рынак у выглядзе нафтапрадуктаў, астатняе экспартуем і на тым зарабляем. Мы можам, вядома, адмовіцца ад 23 мільёнаў тон нафты, а набываць 12, каб знізіць энергаёмістасць, але гэта паўплывае на аб'ём экспартнай выручкі. Бо ў тым ліку за кошт гэтага маем цвёрдую валюту.

## Памылкі і здабыткі мадэрнізацыі

Кажучы пра маштабы праведзенай у краіне мадэрнізацыі, старшыня Савета Рэспублікі прывёў прыклад сітуацыі з цэментнымі заводамі. Сёння іх тры, хоць хапіла б і двух. Калі прымаліся рашэнні аб мадэрнізацыі і, фактычна, новым будаўніцтве трох заводаў, тады панаваў моцны дэфіцыт цэменту. Магутнасці двух ледзь хапала, каб забяспечыць патрэбу ўнутранага рынку. А трэці, планавалася, будзе выпрацоўваць прадукцыю на экспарт. У сувязі з падзеннем коштаў на энерганосьбіты эканомікі ўсіх дзяржаў сціснуліся, аб'ёмы спажывання сыравінных рэсурсаў значна знізіліся, патрэба ў працы трэцяга завода знікла.

Але гэта часовая з'ява, упэўнены спікер. «Па даручэнні Прэзідэнта я курырую працу Беларускага аўтамабільнага завода, і праз продаж кар'ернай тэхнікі мы можам упэўніцца, што ўсё ж такі сусветная эканоміка ўжо ажывае», — заявіў Міхаіл Мясніковіч і дадаў, што нядаўна БелАЗ выйграў тэндар і рыхтуецца заключыць кантракт на пастаўку сарака 110-тонных самазвалаў у Інданезію, якая здабывае вугаль і руды металаў.

Таксама ў працэсе падпісання кантракт на пастаўку 70 «БелАЗаў» у Кузбас, што ў Расіі. «Ужо ў студзені гэтага года мы маем кантракты больш чым на сто цяжкаважных кар'ерных машын. А раз з'явіўся попыт на самазвалы, значыць, павялічваецца здабыча вугалю і руды, а ўслед за гэтым вырастуць і аб'ёмы вытворчасці металу і іншых тавараў. Таму можна прагназаваць ажыўленне эканомікі ў найбліжэйшы час», — упэўнены ён.

Спікер даў прагноз і датычна цэн на нафту, якія ў апошні час «пацягнулі» сусветную эканоміку ўніз. На яго думку, цэны такімі нізкімі будуць нядоўга. «Хоць такія магчымасці ёсць у нафтаздабыўных дзяржаў, якія могуць працаваць на нізкіх цэнах — Саудаўскай Аравіі, Ірана, шэрагу іншых краін Персідскага заліва, дзе сабекошт здабычы вельмі нізкі. Што тычыцца кантынентальных дзяржаў або здабычы на шэльфе, то там сабекошт не 30 долараў, а значна вышэйшы. Я думаю, што ў найбліжэйшы час нафтаздабыўныя дзяржавы будуць больш уважліва глядзець на аб'ёмы здабычы, каб у пэўнай ступені праз іх уздзейнічаць на цэнавы фактар», — лічыць сенатар.

## Ці трэба падтрымліваць стратныя прадпрыемствы?

Па словах парламентарыя, сёння беларуская эканоміка ў асноўным прадстаўлена буйнатаварнай вытворчасцю, і «ніхто і ніколі не будзе закрываць або драбіць вялікія прадпрыемствы». «Яны сёння канкурэнтаздольныя і могуць за кошт эфекту маштабу канкурыраваць на знешніх рынках. І, вядома ж, дзяржава павінна ствараць камфортныя ўмовы для таго, каб яны развіваліся», — лічыць старшыня верхняй палаты беларускага парламента.

Пры гэтым эканоміка Беларусі мусіць прырастаць новымі навукаёмістымі прадпрыемствамі, якія не вельмі матэрыяла- і энергаёмістыя, але даюць высокую дабаўленую вартасць. У якасці прыкладу спікер прывёў стварэнне лекаў, біяпрэпаратаў, мікраэлектронікі. У той жа час ён прызнае, што ёсць прадпрыемствы, неактуальныя сёння на рынку, і ўтрымліваць іх за кошт тых, што эфектыўна працуюць, сэнсу няма.

«Таму з банкруцтва, эканамічнай неплацежаздольнасці не трэба рабіць трагедыі. Усюды ў свеце ідзе гэты працэс: тое, што аджыло — сыходзіць. Тыя прадпрыемствы, якія выконвалі прымітыўныя аперацыі або жылі за кошт першаснай перапрацоўкі мінеральнай сыравіны — тут яшчэ трэба паглядзець, ці варта іх падтрымліваць. Таму што яны не маюць вялікай перспектывы. Яе маюць тыя, дзе высокая ўдзельная вага дабаўленай вартасці», — сцвярджае Міхаіл Мясніковіч.

З іншага боку, варта падтрымаць тых, хто ўласнымі сіламі стварае вытворчасці. Для падтрымкі такіх ініцыятыў у канцы 2015-га і быў прыняты закон аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве.

— Гэты закон не рэйтынгавы, яго прынялі не таму, што ў свеце цяпер робіцца шмат у частцы супрацоўніцтва дзяржавы і прыватнага сектара. Гэта сапраўды заканадаўча замацаваны ўдзел прыватніка ў сферы матэрыяльнай вытворчасці. І нельга глядзець на яго як на злодзея. Прыватнік таксама працуе ў рамках прававога поля, і сёння часам нават больш эфектыўны за дзяржаўныя прадпрыемствы, — кажа старшыня Савета Рэспублікі.

Прыкладам разумнага выкарыстання магчымасцяў закона і прыцягнення замежнага капіталу можа быць стварэнне індыйскіх прадпрыемстваў у Беларусі. «Сёння мы актыўна працуем з індыйскімі кампаніямі, каб залучыць іх у Беларусь для стварэння вытворчасцяў лекаў. Індыя мае добрыя поспехі як па вытворчасці субстанцый, так і па вытворчасці гатовых лекавых формаў», — расказаў спікер. Па яго словах, у наступныя 2-3 гады ў Беларусі будуць пабудаваны як мінімум тры заводы такога кшталту з удзелам індыйскага капіталу. І толькі ў адным будзе доля беларускай дзяржавы, а ў астатніх — беларуска-індыйскі прыватны капітал.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Тры пытанні да ўлады

# СТАЎКА НА ТУРЫЗМ І ЗЕМЛЯРОБСТВА

**Клічаўскі раён больш за ўсё асацыюецца з лясамі, якія займаюць 60% яго плошчы. Тут распрацоўваецца ўнікальны экалагічны фестываль, які стартуе сёлета. А яшчэ гэты край адметны тым, што тут першымі сталі ўкараняць сучасны спосаб дакладнага земляробства, які з дапамогай ІТ-тэхналогій дазваляе выраўноўваць глебавую ўрадлівасць поля. У свой час пры наведванні Прэзідэнтам раёна метад быў прадэманстраваны яму ў дзеянні і атрымаў адабрэнне. Пра тое, як у раёне вырашаюцца звязаныя з гэтымі кірункамі пытанні, наша размова са старшынёй Клічаўскага райвыканкама Францішкам ВАШЧЫЛАМ.**



***— Летась на развіццё дакладнага земляробства Магілёўскай вобласці з інавацыйнага фонду было выдаткавана каля 10 мільярдаў рублёў. Але тры гады таму плюсы «касмічных» тэхналогій першымі ацанілі аграрыі Клічаўскага раёна ў гаспадарцы «Добраахвотнік». Можаце падзяліцца вынікамі?***

— Вынікі ёсць, эканомія адбываецца ў асноўным за кошт мінеральных угнаенняў. Справа добрая, яе трэба развіваць, бо нашы землі вельмі стракатыя па ўрадлівасці. Наогул дакладнае земляробства можна прасоўваць па двух напрамках. Першы дае магчымасць атрымаць максімальную аддачу ад зямлі ўжо сёння. Іншымі словамі, уносіш пэўную колькасць угнаенняў, высяваеш дакладны аб'ём насення і збіраеш ураджай. Але, вырашаючы задачу сёння, мы пакідаем усю гэтую «стракатасць» земляў нашчадкам. А гэта не зусім рацыянальна. Калі мы засявалі першае поле, атрымалася, што зусім не трэба было ўносіць прадугледжаных па разліках калійных ўгнаенняў. Іх дастаткова ў глебе. Таму я прыхільнік іншага напрамку дакладнага земляробства — выраўноўваць урадлівасць глебы з дапамогай дакладнага ўнясення арганічных і мінеральных угнаенняў, вапнавых матэрыялаў і гэтак далей. Гэта будзе планамерная праца на перспектыву. Калі поле выраўнавана па ўрадлівасці, з ім прасцей працаваць і рабіць разлік.

***— Што робіцца ў раёне для падрыхтоўкі будучых кадраў для сельскай гаспадаркі?***

— Летась на базе раёна прайшоў выязны семінар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, у якім прыняў удзел рэзерв кадраў першых намеснікаў старшынь райвыканкамаў, начальнікаў упраўленняў сельскай гаспадаркі і вытворчасці харчавання. Адным з пытанняў стала падрыхтоўка кадраў для сельскагаспадарчай галіны і сучасныя тэхналогіі. Удзельнікі семінара наведалі наш прафесійны аграрна-тэхнічны каледж, які з'яўляецца адной з самых сучасных сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў сельскагаспадарчага профілю ў краіне. Яны азнаёміліся з матэрыяльнай базай, сістэмай падрыхтоўкі кадраў для сельскагаспадарчых прафесій. На базе саўгаса «Добраахвотнік» была адпрацавана практычная частка семінара. Была магчымасць наведаць МТК, сховішча агародніны, машынны двор, ферму, якая будуецца гаспадарчым спосабам. Акрамя гэтага, мы паказалі наш музей і Сялянскую сядзібу — яшчэ адзін музей пад адкрытым небам. Там можна пабачыць, як працуе млын, як паліць па-чорнаму ў лазні, пакаштаваць печаных бліноў. Гэта таксама дапамагае стварыць пазітыўнае ўражанне ад працы на зямлі.

***— Як плануеце ў далейшым развіваць свае тэрыторыі?***

— Агульная плошча земляў у сельскагаспадарчых арганізацыях раёна складае сёння каля 52 тысяч гектараў, з іх сельскагаспадарчых — крыху менш за 43 тысячы. Бал урадлівасці глеб — 27,2; ворных (а гэта 28,6 тысячы га) — 29,9.

Але лясы таксама наша багацце, яны займаюць 60% тэрыторыі. У нас знаходзіцца частка вялікага гідралагічнага заказніка рэспубліканскага значэння «Астравы Дулебы». У гэтым унікальным месцы налічваецца каля 130 відаў раслін і 35 відаў жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу. Плануем сёлета распрацаваць для наведвальнікаў пазнавальныя маршруты для вывучэння фаўны і флоры.

Нашы лясы таксама вядомы гераічным ваенным мінулым. Існуе турыстычны маршрут пад назвай «У партызанскую зону», які прадугледжвае наведванне музея, гістарычную экскурсію па горадзе і месцах баёў часоў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама падарожжа да мемарыяльнага комплексу партызанскай славы «Усакіна». На базе Усакінскай школы збіраемся адкрыць турыстычны візіт-цэнтр. Плануем задзейнічаць гасцініцу лясніцтва Усакіна. Добраўпарадкоўваем крынічку ў вёсцы Альхоўка. У рамках усяго гэтага збіраемся сёлета ўпершыню правесці экалагічны фестываль на астравах Дулебы. Спадзяёмся, што ён стане яркай адметнасцю нашага раёна.

**Пытанні задавала Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

### ВЫРАШЫЦЬ ПРАБЛЕМЫ ПА ТЭЛЕФОНЕ

Званкі па суботах у гарадскую, раённую або абласную адміністрацыю — ужо традыцыя для жыхароў нашай краіны, бо так можна вырашыць пытанні, што называецца, па гарачых слядах. Такая практыка зносін беларусаў з чыноўнікамі існуе са студзеня мінулага года, яна створана ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, а таксама для апературыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

У гэтую суботу, 6 лютага, з 9.00 да 12.00 Мінгарвыканкам і аблвыканкамы правядуць чарговыя «прамыя лініі». На сувязь з грамадзянамі выйдуць:

**Брэсцкі аблвыканкам**
старшыня абласнога Савета дэпутатаў АШМЯНЦАЎ Сяргей Дзмітрыевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні БЕЛАВУС Уладзімір Мікалаевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
старшыня Савета дэпутатаў БАРЫСЕНКА Алег Леанідавіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ЛІСКОВІЧ Віктар Андрэевіч (80152735644);

**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні СІРЭНКА Віктар Іванавіч (80175004160);

**Магілёўскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ЧЫКІДА Алег Іванавіч (80222501869);

**Мінскі гарвыканкам**
першы намеснік старшыні КУХАРАЎ Уладзімір Яўгенавіч (80172224444).

# САМАБЫТНАСЦЬ У АДЗІНЫМ ЦЭЛЫМ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

**Начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Ігар ЧАРНЯЎСКІ** адзначыў, што такая праблема ўзнікла пасля таго, як у свой час у Беларусі былі адменены ліцэнзіі аб правядзенні работ на аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны. Такім чынам, работы ў галіне рэстаўрацыі ў пэўным сэнсе сталі падпарадкоўвацца не законам мастацтва і якасці, а законам рынку: праводзіць аднаўленчыя работы на помніках агульнанацыянальнай важнасці атрымалі магчымасць розныя будаўнічыя фірмы, і запрашаюць тых спецыялістаў, якіх палічаць патрэбным.

Наталля Качанава падагульніла, што для вырашэння гэтай праблемы неабходна задзейнічаць розныя ведамствы, таму адпаведныя даручэнні варта накіраваць у міністэрствы культуры, адукацыі, архітэктуры і будаўніцтва.

### АДКУЛЬ ПРЫЕХАЛІ СВЯТАРЫ?..

Як высветлілася, кадравыя праблемы ёсць не толькі ў сферы рэстаўрацыі. Зусім мала айчынных святароў служыць у каталіцкіх касцёлах. Пра гэта расказаў Леанід Гуляка:

— Рымска-каталіцкая царква ў Беларусі, як і раней, недастаткова актыўна працуе па падрыхтоўцы кадраў. Напрыклад, у Пінскай семінарыі ў 2015 годзе не было ніводнага выпускніка, і ўсяго адзін чалавек паступіў на першы курс. У каталіцкай тэалагічнай акадэміі, што адкрылася ў 2015 годзе, няма ніводнага навучэнца, і, як вынік, ёсць кадравая праблема і запрашэнне значнай колькасці святароў з-за мяжы. Пры гэтым некаторыя замежныя ксяндзы слаба валодаюць навыкамі зносін на дзяржаўных мовах Рэспублікі Беларусь і рэдка выкарыстоўваюць іх для правядзення набажэнстваў, што выклікае справядлівую нязгоду вернікаў.

### ТАЛЕРАНТНАСЦЬ, АЛЕ НЕ ЎСЁДАЗВОЛЕНАСЦЬ

Леанід Гуляка дадаў, што наша заканадаўства, якое рэгулюе рэлігійныя пытанні, досыць талерантнае. Дзяржава не ўмешваецца ва ўнутраныя пытанні канфесій. Аднак парушальнікам давядзецца несці адказнасць. Так, упаўнаважаны ў будучыні не выключае магчымасці зняцця з рэгістрацыі некаторых суполак сведак Іеговы. Ён прывёў пэўныя факты парушэнняў у 2015 годзе гэтай рэлігійнай супольнасцю дзейнага заканадаўства. У прыватнасці, у рэгіёнах Беларусі яны датычыліся распаўсюджвання літаратуры рэлігійнага зместу без адпаведнага ўзгаднення з мясцовымі органамі ўлады. Паводле слоў Леаніда Гулякі, настойлівыя і неправамерныя дзеянні прадстаўнікоў рэлігійных суполак сведак Іеговы выклікаюць пэўнае нездавальненне сярод жыхароў краіны ў цэлым і вернікаў іншых канфесій у прыватнасці.

***

На калегіі гаварылася таксама пра неабходнасць больш актыўна развіваць рэлігійны турызм. Напрыклад, святары ў рэгіёнах і сталіцы маглі б самастойна праводзіць экскурсіі ў сваіх храмах, бо менавіта яны дасканала ведаюць іх гісторыю і маглі б не горш за экскурсаводаў расказаць пра яе наведвальнікам.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

# ДАЙСЦІ ДА КОЖНАГА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Падчас мінулага перапісу некаторыя прадстаўнікі часовага персаналу сутыкаліся з тым, што паўналетнія, якіх апытвалі, адмаўляліся даваць звесткі аб адсутных на той момант у кватэры членах сям'і.

— У сувязі з гэтым дзеля поўнага ахопу насельніцтва праектам закона прадугледжваецца ўстанаўленне абавязку для паўналетняга члена сям'і паведамляць звесткі пра адсутных падчас правядзення перапісу членах сям'і, — адзначыў дэпутат.

Праект закона канкрэтызуе абавязкі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў у тым, што тычыцца ўзаемадзеяння з дзяржаўнымі структурамі, якія здзяйсняюць падрыхтоўку і правядзенне перапісу насельніцтва, а таксама падбор часовага перапіснога персаналу.

— Пры падрыхтоўцы і правядзенні перапісу насельніцтва ў нашай краіне ў 2019 годзе плануецца прыцягнуць часовы перапісны персанал без выплаты ўзнагароджання, але з захаваннем заработнай платы або стыпендыі па асноўным месцы працы ці вучобы, — праінфармаваў дэпутат.

### БЕЗ ЗНАЧКА, АЛЕ З ПАСВЕДЧАННЕМ

Значнае месца ў праекце закона надаецца і эканоміі бюджэтных сродкаў.

— У 2009 годзе кожнаму прадстаўніку часовага персаналу, занятаму ў перапісе, выдаваўся нагрудны значок і пасведчанне, — нагадаў Ілья Мурашка. — А на выраб гэтых значкоў падчас мінулага перапісу выдаткавана 65 тысяч долараў ЗША. Па сутнасці ж, гэтыя значкі не патрэбны, і падчас наступнай кампаніі па перапісе насельніцтва часовым супрацоўнікам будзе выдавацца толькі пасведчанне.

Яшчэ адна крыніца эканоміі — раней значная сума грошай трацілася на захаванне звестак аб перапісе на папяровым носьбіце.

— Раней звесткі аб перапісе захоўваліся на папяровым носьбіце на працягу трох гадоў. Пасля гэта ўсё перадавалася на захоўванне ў галоўны архіў краіны. Выдаткі ў 2009 годзе, звязаныя з перадачай перапісных лістоў, іншай перапіснай дакументацыі для архіўнага захоўвання, склалі 413 тысяч долараў ЗША. У гэтым законапраекце адпаведныя моманты ўлічаны, у сувязі з чым прадугледжваецца, што часова захоўвацца на працягу трох гадоў перапісныя лісты будуць, але наступная перадача ў цэнтральны архіў будзе здзяйсняцца толькі на лічбавым носьбіце.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*


**Извещение о проведении 16 февраля 2016 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскремстрой»**

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | | |
|---|---|---|---|---|
| № | Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Местонахождение предмета торгов | Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| 1. | помещение физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения с инвентарным номером 500/D-7025745, общая площадь 624,8 кв. м | г.Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 25 | 5 908 912 800 | 59 000 000 |
| 2. | административное помещение с инвентарным номером 500/D-708150242, общая площадь 2008,7 кв. м | г.Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 27 | 18 792 732 000 | 1 500 000 000 |
| 3. | административное помещение с инвентарным номером 500/D-708150241, общая площадь 11,7 кв. м | г.Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 26 | 246 281 280 | 24 000 000 |

**Продавец имущества:** ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220050, г.Минск

**Организатор торгов:** УП «Минский городской центр недвижимости», ул.К.Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов**: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся 16 февраля 2016 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 04.02.2016 по 12.02.2016 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»); (017)200-99-78, (029)350-46-23 (ОАО «Минскремстрой»).**


■ Меркаванне

# АДКАЗЫ НА ВЫКЛІКІ СУЧАСНАСЦІ



*«Вы не можаце чакаць, пакуль ваш дом згарыць, каб набыць страхавы поліс. Так і мы не можам чакаць, пакуль у грамадстве пачнуцца масавыя некантраляваныя змены, каб пачаць рыхтавацца да чацвёртай прамысловай рэвалюцыі».*
Праф. Роберт Шылер,
нобелеўскі лаўрэат па эканоміцы 2013 г.

**Апошнім часам мы пастаянна звяртаемся да тэмы велізарных выклікаў, якія паўсталі перад чалавечай супольнасцю. Міграцыйны крызіс і нарастанне нацыянальна-культурных супярэчнасцяў у ЕС, геапалітычныя канфлікты і праблемы сістэмы бяспекі, нарэшце, новая мадэль сусветнай эканомікі, што фарміруецца на нашых вачах, — усё гэта сапраўды нагадвае сюжэты з прац футуролагаў. Але ж якімі б неверагоднымі ні былі гэтыя сюжэты, для нашай дзяржавы галоўнае — знайсці свае адказы на ўсе выклікі сучаснасці і павярнуць іх на карысць Беларусі.**

Мы з'яўляемся неад'емнай часткай глабалізаванага свету, з усімі яго хібамі і магчымасцямі. Мы — малая адкрытая эканоміка, якая ў вялікай ступені залежыць ад вонкавых рынкаў і фінансавага стану нашых знешнегандлёвых партнёраў. Таму, вядома, у пэўнай ступені сённяшнія эканамічныя праблемы прыйшлі да нас звонку (больш дакладна, з усходу, бо на захадзе назіраецца эканамічны рост). Але ж Беларусь — суверэнная дзяржава. І таму не важна, адкуль прыходзяць праблемы, важна, што менавіта нам трэба іх вырашаць.

А каб вырашаць, неабходна добра разумець, куды рухаецца свет, ад якога мы так залежым. Неабходна крочыць з гэтым светам разам, а ў чымсьці і абганяць яго.

У гэтым сэнсе варта звярнуць увагу на чарговы Сусветны эканамічны форум, які нядаўна завяршыўся ў швейцарскім Давосе. Як звычайна, ён сабраў кіраўнікоў краін і міжнародных арганізацый, топ-менеджараў найбольш паспяховых кампаній, старшыняў буйных банкаў, вядучых вучоных і экспертаў. Галоўнай тэмай іх дыскусій сёлета стала чацвёртая прамысловая рэвалюцыя, г. зн. сістэмныя змены, якія чакаюць сусветную эканоміку і якія ў перспектыве адаб'юцца на ўсіх баках чалавечага жыцця.

Нагадаю, першая прамысловая рэвалюцыя заключалася ў выкарыстанні вады і пару для механізацыі вытворчасці. Пасля другой рэвалюцыі электрычнасць стала асновай масавай вытворчасці, пачаў падзел працы. Трэцяя стала магчымай дзякуючы электроніцы і інфармацыйным тэхналогіям, якія прывялі да аўтаматызаванай вытворчасці. Чацвёртая рэвалюцыя, як адзначаецца ў матэрыялах давоскага форуму, будзе характарызавацца «сумессю тэхналогій, якая размые падзел паміж фізічнай, лічбавай і біялагічнай сферамі». Іншымі словамі, гэта эпоха бясконцых інавацый, якія базуюцца на самых непрадказальных камбінацыях тэхналогій, для распрацоўкі якіх больш не патрэбны буйныя заводы ці транснацыянальныя карпарацыі. Увасабленнем новай эпохі ў сусветнай эканоміцы з'яўляюцца нана- і біятэхналогіі, 3D-прынтары, штучны інтэлект, робататэхніка, аўтаномныя машыны і г.д.

Чацвёртая прамысловая рэвалюцыя адметная хуткасцю і маштабам распаўсюджвання новых тэхналогій, што імкліва мяняюць усе сферы чалавечага жыцця. Зразумела, што гэта з'яўляецца адначасова велізарным выклікам краінам і іх грамадствам, але адначасова і магчымасцю для іх «скокнуць» на новую, больш высокую прыступку развіцця, стаць больш канкурэнтаздольнымі ў сусветнай эканоміцы.

Што ж у такіх сусветных абставінах на фоне шматлікіх выклікаў і на парозе чарговай прамысловай рэвалюцыі рабіць Беларусі?

Глупствам было б цяпер абвяшчаць нацыянальны конкурс пад назвай «Якая тэхналогія дазволіць Беларусі ажыццявіць пераход у новую прамысловую эпоху?». Хоць пра неабходнасць цэнтралізаванага пошуку такога кшталту тэхналогій любяць расказваць некаторыя з нашых чыноўнікаў і супрацоўнікаў Акадэміі навук. У іх на ўсё адзін адказ — трэба зацвердзіць і прафінансаваць чарговую дзяржаўную праграму па пошуку прарыўных ідэй. Яно і зразумела: для іх гэта добрая магчымасць атрымаць новае бюджэтнае фінансаванне і як мінімум забяспечыць сабе матэрыяльны дабрабыт на некалькі гадоў наперад. А што там атрымаецца — гэта пытанне другаснае: час, так бы мовіць, пакажа.

І вось жа ён і паказвае нам ужо колькі гадоў, што стаўка на нейкія цэнтралізаваныя прарыўныя тэхналогіі, на жаль, не вельмі спрацоўвае. І калі мы хочам усё ж такі ўвайсці ў новую прамысловую эпоху канкурэнтаздольнымі, то нам трэба тэрмінова адмаўляцца ад гэтых практык.

Увогуле трэба зразумець, што сучасны свет надзвычай складаны, каб дзяржава ці нейкая іншая цэнтралізаваная інстытуцыя магла трымаць усё пад кантролем і забяспечваць імклівае развіццё. Не таму, што дзяржава дрэнная ці чыноўнікі некампетэнтныя, а таму, што жыццё стала вельмі шматгранным і складаным.

Сённяшні свет — гэта час штодзённых інавацый. І трэба навучыцца жыць у такой дынаміцы. Гэта тычыцца і суб'ектаў гаспадарання, і органаў дзяржаўнага кіравання, і грамадскіх аб'яднанняў, і кожнага асобнага чалавека. Як бы банальна гэта ні гучала, але ж тыя, хто не зможа своечасова адаптавацца да жыцця ў новых умовах, не пройдуць праверку сучаснасцю і знікнуць на звалцы гісторыі.

Вельмі важна не праспаць момант! Жыць не так, як прызвычаіліся, а выходзіць з так званай зоны камфорту. І галоўная наша задача — зрабіць Беларусь месцам, якое вабіць: перш за ўсё саміх беларусаў, а таксама замежных высокакласных спецыялістаў і інвестараў, вядучых навукоўцаў, моладзь, турыстаў. Беларусь мусіць стаць краінай магчымасцяў.

Дзеля гэтага, на маю думку, трэба сканцэнтравацца на двух прыярытэтах.

Першае — сістэма дзяржкіравання і рэгулявання. Іншымі словамі, інстытуты. Як казаў Томас Джэферсан, «па меры таго, як змяняюцца абставіны, грамадскія і дзяржаўныя інстытуты мусяць таксама ўдасканальвацца, каб адпавядаць свайму часу». Калі сучасная дзяржава не ў стане забяспечваць пастаяннае развіццё і эканамічны рост цэнтралізавана, то яна мусіць ствараць самыя лепшыя ўмовы для людзей і бізнесу, каб яны выкарыстоўвалі ўвесь свой патэнцыял на карысць сваім сем'ям і ўсёй краіне. Тая дзяржава, якая выйграе спаборніцтва па стварэнні найлепшых інстытутаў, умоў для бізнесу і творчага развіцця людзей, забяспечыць свой суверэнітэт і канкурэнтаздольнасць у часы чацвёртай прамысловай рэвалюцыі.

Другое — сістэма адукацыі. У эканоміцы будучыні, на жаль, стане павялічвацца разрыў у дабрабыце паміж высока- і нізкакваліфікаванымі кадрамі. У вялікай ступені кваліфікацыя — гэта пытанне адукацыі. Таму надзвычай важна разабрацца не толькі з тым, што і на якім узроўні выкладаюць у нашых ВНУ, але ж і з тым, хто выкладае. Часам паслухаеш некаторых нашых прафесараў эканомікі, дык проста жах бярэ. Якіх спецыялістаў рыхтуюць тыя, хто ў XXI стагоддзі так і застаўся ў канспектах па марксізме-ленінізме?



Фота БЕЛТА.

**Яўген ПРЭЙГЕРМАН**

# ПАДЛІЧЫЦЬ І РАЗЛІЧЫЦЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

І ў гэтым выпадку існуе выключэнне з правілаў, калі нерухомая маёмасць была атрымана ў спадчыну. Атрымліваецца, што прадаваць у кароткі тэрмін можна любую колькасць машын, дамоў, дач ці зямельных участкаў, калі ўсё гэта было атрымана ў спадчыну. І галоўнае, што плаціць падаткі ў гэтым выпадку не трэба.

А вось калі ўласнік летась прадаў адзін і больш аб'ектаў нерухомасці, якія не адносяцца да кватэры, жылога дома з гаспадарчымі пабудовамі (пры іх наяўнасці), дачы, садовага доміка, гаража, машына-месца і зямельнага ўчастка, тады ён абавязаны запоўніць дэкларацыю.

## Ацэньваем долі, паі і падарункі

У дэкларацыю трапляюць і тыя даходы, якія былі атрыманы ад продажу ці іншага выплатнага адчужэння долі (паю, часткі долі або паю) у статутным фондзе арганізацыі іншай фізічнай асобе. Тут, як той казаў, без варыянтаў. Іншая справа — падарункі.

Калі чалавек летась атрымліваў даходы ў выглядзе дарэння ад фізічных асоб, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, у памеры, большым за 43,7 млн рублёў ад усіх крыніц на працягу года, тады без дэкларацыі яму не абысціся. Падаткаабкладанню падлягае менавіта сума такога перавышэння. У гэтым выпадку падлічваецца не толькі сума грашовых падарункаў, але ўлічваецца і кошт іншай маёмасці, у тым ліку нерухомай.

Выключэнне складаюць выпадкі атрымання даходаў ад блізкіх сваякоў і асоб, якія знаходзяцца паміж сабой у адносінах сваяцтва. Менавіта тады падобныя падарункі вызваляюцца ад падаходнага падатку незалежна ад памеру атрыманага ў выніку дарэння даходу.

**Даведка МПЗ.** ***Да блізкіх сваякоў адносяцца бацькі (усынавіцелі), дзеці (у тым ліку ўсыноўленыя, удачароныя), родныя браты і сёстры, дзед, бабка, унукі, прадзед, прабабка, праўнукі, муж і жонка. Да асоб, якія знаходзяцца паміж сабой у адносінах сваяцтва, адносяцца блізкія сваякі мужа (жонкі), у тым ліку памерлага.***

## Заробкі ад арэнды лепш падлічыць да рубля

Цяпер некалькі слоў пра тых, хто летась здаваў сваю ўласную кватэру на працяглы тэрмін і плаціў фіксаваны падатак. Цяпер яны павінны падлічыць гэты даход ад здымнага жылля за ўсе 12 месяцаў. Калі такія даходы ад здачы ўнаём жылых і нежылых памяшканняў дасягнулі агульнай сумы 43 млн 660 тысяч рублёў і больш, тады трэба наведваць падатковую інспекцыю. Потым такія даходы абкладаюцца падаходным падаткам па стаўцы 13 працэнтаў. Пры гэтым сумы падаходнага падатку ў фіксаваных сумах, выплачаныя за 2015-ты, падлягаюць заліку пры вылічэнні падатку па стаўцы 13 працэнтаў.

Напрыклад, у прэс-службе МПЗ падлічылі, што пры атрыманні агульнага даходу за здачу аднапакаёвай мінскай кватэры ў памеры 50 млн рублёў дадатковы аб'ём падаходнага падатку па пададзенай дэкларацыі складзе каля 4,5 млн рублёў. І гэтую суму ўласніку жылля лепш падлічыць і заплаціць добраахвотна, бо інакш канчатковыя сумы выдаткаў будуць у разы большыя.



## Даходы з-за мяжы

Спецыялісты падатковай галіны асобна адзначаюць, што абавязкова дэкларуюцца любыя даходы, што былі атрыманы за мяжой і (або) з-за мяжы нашай краіны.

Гэта могуць быць грошы ад працы па найме (кантракту), даходы ад продажу акцый або іншых каштоўных папер, ад продажу доляў у статутных фондах замежных арганізацый, у выглядзе працэнтаў па рахунках (укладах) у замежных банках, атрыманыя ў дар ад замежных грамадзян і інш.

Фактычна выплачаныя ў адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы сумы падатку з даходаў, атрыманых у такой замежнай дзяржаве (за выключэннем даходаў, атрыманых з афшорных зон), падлягаюць заліку пры вызначэнні сумы падаходнага падатку, які налічваецца падатковым органам Беларусі на падставе падатковай дэкларацыі.

## Пры спыненні будаўніцтва і пагашэнні жыллёвых аблігацый

Абавязкова дэкларуецца даход, атрыманы кліентам праз механізм вяртання раней унесеных сродкаў пры спыненні будаўніцтва жылля, а таксама ў выпадку патаннення такога будаўніцтва альбо ў выпадку выбыцця фізічнай асобы з членаў арганізацый забудоўшчыкаў.

Тут спецыялісты падатковай галіны адзначаюць, што вернутыя пры гэтым грашовыя сродкі, у тым ліку паявыя ўзносы, падлягаюць падаткаабкладанню падаходным падаткам у выпадку, калі на такія ўзносы раней быў прадастаўлены маёмасны падатковы вылік. У гэтым выпадку фізічная асоба, якой ў 2015 годзе былі вернуты названыя вышэй грашовыя сродкі, абавязана падаць у падатковы орган падатковую дэкларацыю і заплаціць падаходны падатак у дачыненні да сум, на якія яму раней была прадастаўлена льгота па падаходным падатку ў выглядзе маёмаснага падатковага выліку.

Неабходна дэклараваць і даходы, атрыманыя ў выглядзе грашовых сродкаў пры пагашэнні (датэрміновым пагашэнні) жыллёвых аблігацый, а таксама ў выглядзе вяртання грашовых сродкаў, унесеных у аплату кошту жылога памяшкання шляхам набыцця жыллёвых аблігацый, у выпадку невыканання забудоўшчыкам абавязацельстваў па дагаворы. Дэкларацыя тут падаецца ў тым выпадку, калі па такіх унесеных сумах для набыцця жыллёвых аблігацый раней быў прадастаўлены маёмасны падатковы вылік.

Такім чынам, былы забудоўшчык, які атрымаў летась такія грашовыя сродкі, абавязаны падаць у падатковы орган падатковую дэкларацыю і заплаціць падаходны падатак у дачыненні да сум, на якія яму раней была прадастаўлена льгота па падаходным падатку ў выглядзе маёмаснага падатковага выліку.

## Прадугледжана адказнасць

У тым выпадку, калі грамадзянін, абавязаны гэта зрабіць, забыўся ці вырашыў не падаваць дэкларацыю, то ён атрымае штраф — 2 базавыя велічыні (сёння гэта 410 тысяч рублёў) плюс па 0,5 базавай за кожны месяц пратэрміноўкі. Аднак потым і падаткі неабходна будзе заплаціць цалкам.

Дарэчы, калі дэкларацыю аб даходах за мінулы год неабходна падаваць да 1 сакавіка, то заплаціць падаткі ў бюджэт неабходна будзе да 15 мая.

## Можна атрымаць падатковыя вылікі

Калі чалавек пераплаціў падаходныя падаткі за мінулы год, то праз інспекцыю гэтыя грошы ён можа яшчэ вярнуць. У гэтым выпадку дэкларацыю аб даходах за год падаюць тыя грамадзяне, якія маюць права на атрыманне падатковых вылікаў (сацыяльных, маёмасных і прафесійных), пры ўмове, што абавязак па прадастаўленні такіх вылікаў грамадзянам ускладзены на падатковыя органы. Увогуле ўзор формы падатковай дэкларацыі аб даходах за год можна знайсці на афіцыйным сайце Міністэрства па падатках і зборах (www.nalog.gov.by).

Менавіта на гэтым сайце прэс-служба міністэрства запусціла новы электронны сэрвіс «Падатковы калькулятар». Прэс-сакратар міністэрства Сяргей Шкут паведаміў нам, што гэты сэрвіс дазваляе любому карыстальніку самастойна разлічыць суму падаходнага падатку з фізічных асоб — для гэтага неабходна толькі ўвесці адпаведную інфармацыю. Разлік падатку з грамадзян з дапамогай гэтага сэрвісу носіць азнаямленчы характар. Асноўнымі данымі для разліку падаходнага падатку з фізічных асоб з'яўляюцца від даходу, сума даходу, які падлягае падаткаабкладанню, і наяўнасць месца асноўнай працы. Таксама ўводзяцца звесткі аб праве на падатковыя льготы і вылікі, у тым ліку наяўнасць дзяцей і ўтрыманцаў, сума выдаткаў на адукацыю, страхаванне і будаўніцтва жылля.

## Май на ўвазе

Дэклараваць свае даходы па выніках года павінны і тыя грамадзяне, у каго ўтрыманне падатку з такіх сум не прадугледжана падатковымі агентамі — арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Дэкларацыю аб даходах і маёмасці могуць патрабаваць у любога грамадзяніна ў тым выпадку, калі ў падатковай інспекцыі ўзнікнуць пытанні аб тым, за якія даходы была набыта тая ці іншая маёмасць. А вось тэрміну даўнасці па падатковых парушэннях не існуе. Як правіла, праверкі ажыццяўляюцца за апошнія 10 гадоў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Сітуацыя

# ЗІМОВАЯ ПАВОДКА НАШЫМ РЭКАМ ТОЛЬКІ НА КАРЫСЦЬ

## А вось на лёд лепей не выходзіць

**Сёння на большасці рэк захоўваецца ледастаў і ледастаў з палонкамі, а таўшчыня лёду ў асноўным складае 15—28 см. На вадаёмах жа назіраецца суцэльнае ледзяное покрыва таўшчынёй ад 20—30 см, паведамляе Белгідраметцэнтр. Між іншым, сітуацыя даволі хутка мяняецца, бо ў бліжэйшыя дні разбурэнне ледзянога покрыва на рэках будзе працягвацца, а рост узроўняў вады захаваецца, паведаміла карэспандэнту «Звязды» начальнік аддзела гідралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Марына НАГІБІНА.**



Спецыяліст лічыць, што цяпер выходзіць на лёд сапраўды небяспечна. На рэках лёд па ўсёй шырыні неаднародны, у асобных месцах таўшчыня яго можа вагацца ад 5 да 20 сантыметраў. Ужо сёння адбываецца змяненне структуры лёду, яго пацямненне, а часам і ўзнікненне расколін. Такі лёд сапраўды няўстойлівы, а ў асобных месцах назіраюцца аб'ёмныя палонкі. Марына Нагібіна ўпэўнена, што падобная гідралагічная сітуацыя працягнецца ў нашай краіне як мінімум да канца усёй першай дэкады лютага.

На рэках адбываецца фарміраванне зімовай паводкі, пры гэтым сутачны рост узроўняў вады складае 1—30 см. Вада выйшла на пойму на Нёмане ў вёсцы Беліца і Віліі каля вёскі Сцешыцы. У наступныя дні разбурэнне ледзянога покрыва на рэках будзе працягвацца, рост узроўню вады захаваецца. Вада выйдзе на пойму на рэках Нараў каля вёскі Нямержа і Свіслач каля вёскі Церабуты.

Увогуле спадарыня Нагібіна лічыць, што выхад вады на пойму з'яўляецца спрыяльнай падзеяй для басейнаў нашых рэк. Справа ў тым, што да гэтага часу (асабліва — летам і восенню) у рэчышчах захоўваліся малыя ўзроўні вады.

**Падобная гідралагічная сітуацыя працягнецца ў нашай краіне як мінімум да канца усёй першай дэкады лютага.**

А вада на поймах узбагачае глебу, пасля чаго на такіх зямельных участках можна чакаць добрага ўраджаю. Паводле слоў спецыяліста, нават прыватнікі, якія маюць свае надзелы ў межах поймаў, сапраўды рады, калі на іх агароды выходзіць вялікая вада.

Між іншым, сапраўды сур'ёзных падтапленняў населенных пунктаў спецыялісты не чакаюць. «Справа ў тым, што воднасць беларускіх рэк на старце зімовага пацяплення была даволі нізкая, таму пагрозы да масавай і аб'ёмнай паводкі на нашай тэрыторыі няма», — упэўнена Марына Нагібіна. А яшчэ яна лічыць, што паступленне чыстай павадкавай вады ў рэкі і вадасховішчы краіны толькі палепшыць экалагічны стан нашай воднай сістэмы.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ На слыху

# АЛІМПІЙСКІЯ ГУЛЬНІ АЗМРОЧЫЦЬ ЛІХАМАНКА ЗІКА?

**Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ) прызнала вірус ліхаманкі Зіка, які распаўсюджваецца на паўднёваамерыканскім кантыненце, пагрозай сусветнага маштабу. А ўлады Бразіліі рэкамендавалі цяжарным жанчынам прапусціць летнія Алімпійскія гульні 2016 года ў Рыа-дэ-Жанэйра з-за распаўсюджвання ліхаманкі.**

Па стане на 31 студзеня ў Калумбіі было выяўлена больш як 20,2 тысячы выпадкаў заражэння ліхаманкай Зіка. Сярод хворых — 2,1 тысячы цяжарных жанчын. 27 студзеня першы заражаны вірусам Зіка быў выяўлены ў ЗША. Па прагнозах СААЗ, вірусам Зіка могуць захварэць ад трох да чатырох мільёнаў чалавек на тэрыторыі Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі. Генеральны дырэктар СААЗ Маргарэт Чэн заявіла, што сітуацыя патрабуе скаардынаванай міжнароднай рэакцыі. Аднак пры гэтым няма неабходнасці ўводзіць абмежаванні на паездкі або гандаль.

Вірус Зіка ўпершыню быў выяўлены ў 1947 годзе ва Угандзе ва ўзоры, узятым у малпы, але да нядаўняга часу ён лічыўся бяспечным для чалавека. У 2015 годзе вірус трапіў з Афрыкі і Азіі ў Паўднёвую Амерыку, пасля чаго вельмі хутка распаўсюдзіўся па мацерыку. На сённяшні дзень выпадкі заражэння зарэгістраваныя ў 23 краінах і тэрыторыях рэгіёна. Заражэнне чалавека адбываецца праз укусы камароў.

Вірус Зіка не адносіцца да ліку смяротных. Нягледзячы на тое, што ён яшчэ не забіў ніводнага чалавека, існуе цэлы шэраг прычын яго баяцца, асабліва цяжарным жанчынам. З'яўленне віруса ў некаторых рэгіёнах суправаджалася рэзкім павелічэннем колькасці выпадкаў нараджэння дзяцей з чэрапам анамальна малых памераў і выпадкаў сіндрому Гіёна-Барэ.

**Па прагнозах СААЗ, вірусам Зіка могуць захварэць ад трох да чатырох мільёнаў чалавек на тэрыторыі Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі.**

Наяўнасць прычынна-выніковай сувязі паміж заражэннем вірусам Зіка і развіццём прыроджаных парокаў і неўралагічных сіндромаў пакуль не даказана, але ёсць сур'ёзныя падазрэнні, што такая сувязь існуе.

Эксперты СААЗ канстатуюць, што арэал распаўсюджвання разносчыкаў віруса вельмі шырокі. Да таго ж у гэтым годзе ўмовы надвор'я, звязаныя з характарыстыкамі цячэння Эль-Ніньё, будуць спрыяць сур'ёзнаму росту папуляцыі камароў.

Тым не менш ні лекаў, ні вакцыны супраць віруса, ні сродкаў экспрэс-дыягностыкі пакуль не існуе. Дзве буйныя фармацэўтычныя кампаніі (Glaxosmithkline і Санофі СА) толькі разглядаюць магчымасць стварэння вакцыны супраць віруса Зіка.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** nikalaeva@zviazda.by

■ Жыллё

# ЧЭКАМ «МАЁМАСЦЬ» ДАЛІ ЯШЧЭ ТРЫ ГАДЫ

**Такім чынам, адпаведнай пастановай Саўміна тэрмін абарачэння гэтых імянных прыватызацыйных чэкаў у Беларусі ўстаноўлены па 30 чэрвеня 2019 года.**

У прэс-службе Дзяржаўнага камітэта па маёмасці нам паведамілі, што прыватызацыйны чэк забяспечаны дзяржаўнай уласнасцю, якая падлягае бязвыплатнай перадачы грамадзянам Беларусі і сведчыць аб праве яго ўладальніка на долю ў дзяржаўнай уласнасці, якая прыватызуецца, і вызначае памер гэтай долі (квоты). Абмен імянных прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць» на акцыі ажыццяўляецца праз аддзяленні Беларусбанка па месцы жыхарства, дзе адкрыты спецыяльныя чэкавыя рахункі грамадзян.

У аддзяленнях гэтай фінансавай установы маецца пералік адкрытых акцыянерных таварыстваў, акцыі якіх прапануюцца для абмену. Інфармацыю аб выніках фінансава-гаспадарчай дзейнасці гэтых акцыянерных таварыстваў і аб велічыні дывідэндаў, якія налічваюцца, можна даведацца на сайце Міністэрства фінансаў.

Набываючы акцыі, грамадзянін становіцца акцыянерам і, у адпаведнасці з заканадаўствам, мае права ўдзельнічаць у кіраванні таварыствам, атрымліваць інфармацыю аб дзейнасці прадпрыемства, а таксама прадаваць, дарыць і атрымліваць у спадчыну акцыі.

У адпаведнасці з заканадаўствам акцыянернае таварыства мае права накіроўваць частку прыбытку, якая застаецца ў яго распараджэнні пасля выплаты падаткаў, іншых абавязковых плацяжоў і пакрыцця страт бягучых перыядаў, на выплату дывідэндаў акцыянерам таварыства. Рашэнне па размеркаванні прыбытку прымаецца на агульным сходзе акцыянераў.

А пры жаданні набытыя акцыі можна прадаць. Продаж ажыццяўляецца праз акцыянернае таварыства «Беларуская валютна-фондавая біржа» пры пасрэдніцтве прафесійнага ўдзельніка рынку каштоўных папер, які з'яўляецца ўдзельнікам біржы. Спісы прафудзельнікаў маюцца на сайце ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа».

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Маніторынг

# ДЗЕЛЯ ДАВЕРУ ЛЮДЗЕЙ

## Інфармацыйна-аналітычны цэнтр пры Адміністрацыі Прэзідэнта агучыў вынікі апытання аб дзейнасці праваахоўных і кантралюючых органаў

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе Міністэрства ўнутраных спраў адзначыў, што работа міліцыі дае магчымасць мець належны ўзровень грамадскай бяспекі ў краіне.**

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы спасылаўся і на вынікі сацыяльнага даследавання. Паводле яго слоў, амаль 82 працэнты апытаных заявілі, што адчуваюць сябе ў бяспецы на вуліцах і ў грамадскіх месцах. Больш у гэтым упэўнены жыхары Гродзенскай і Мінскай абласцей **(86,5% апытаных)**, менш — тыя, хто жыве ў Мінску, Брэсцкім і Магілёўскім рэгіёнах **(79%)**.

Што тычыцца дзейнасці праваахоўных органаў, 28 працэнтаў лічаць, што яна за апошні час палепшылася, а 39 працэнтаў апытаных розніцы ў працы за апошні час не ўбачылі.

Большасць рэспандэнтаў засталіся задаволенымі рэжымам працы і абслугоўваннем насельніцтва ў структурах **МУС (71,5%)** і толькі 5 працэнтаў мяркуюць інакш. 57 працэнтаў удзельнікаў даследавання задаволены прафесіяналізмам, аператыўнасцю, прыстойнасцю, тактоўнасцю праваахоўнікаў.

Вынікі апытання таксама сведчаць аб тым, што за апошні год, як і ў мінулыя перыяды, грамадзяне найчасцей звярталіся па дапамогу, рашэнне ўзніклых пытанняў у органы ўнутраных спраў. Сярод іх больш за палову **(55,5%)** адзначылі, што іх праблемы вырашылі паспяхова.




У выніку дадзеныя паказалі, узровень даверу праваахоўных органаў склаў 67 працэнтаў. Найбольш беларусы давяраюць супрацоўнікам пракуратуры **(73%)** і судоў **(71%)**. Большасць насельніцтва краіны **(69%)** адчувае сябе абароненай ад магчымага самавольства міліцыі.

**Якаў ЖУРБІН.** *taras@zviazda.by*

■ Літаратурныя сувязі

# УГЛЯДАЮЧЫСЯ АДНО Ў АДНАГО

**У Літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа прайшла вечарына, прысвечаная 135-годдзю кітайскага пісьменніка Лу Сіня (1881 — 1936) і 110-годдзю з пачатку літаратурнай дзейнасці Якуба Коласа. Удзел у імпрэзе прынялі кітайскія і беларускія студэнты, пісьменнікі, журналісты, музейныя работнікі.**

З вітальным словам да прысутных звярнуўся першы сакратар Пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Чжан Хунвэй. «І Лу Сінь, і Якуб Колас — пісьменнікі адной часавай прасторы, адных сацыяльных перакананняў, — заўважыў кітайскі госць, — і з вышыні сённяшняга часу хіба ж не цікава зазірнуць у іх творы, шукаючы падабенства, аднолькавыя сімвалы?.. Мне прыемна ўсведамляць, што шырыцца прастора кітайскага мастацкага слова ў Беларусі».

Вёў вечарыну лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, вядомы паэт і перакладчык Мікола Мятліцкі. Яго досвед у беларуска-кітайскіх мастацкіх стасунках выкліканы яшчэ і тым, што Мікалай Міхайлавіч падрыхтаваў і выдаў аўтарскую кнігу перакладаў «Пад крыламі Дракона. Сто паэтаў Кітая». Пра любоў да Кітая, пра ўласныя паездкі ў Паднябесную, пра знаёмства з перакладчыкам Гао Манам распавёў паэт, празаік, публіцыст і перакладчык Навум Гальпяровіч. Дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч расказаў пра выдадзеныя ў «Звяздзе» кнігі кітайскіх паэтаў Ван Вэя, Лі Бо, Ду Фу, Ай Ціна, пра тое, што ў серыі «Светлыя знакі. Паэты Кітая» падрыхтаваны новы зборнік. На гэты раз — вершаў Лі Хэ. У значнай ступені праект рэалізоўваецца дзякуючы руплівасці перакладчыцы Алены Раманоўскай. У кнізе — і яе пераклады, і пераклады іншых творцаў, зробленыя дзякуючы падрадкоўнікам, якія падрыхтавала з мовы арыгінала Алена Раманоўская.





Фота Кастуся ДРОБАВА.

**Сяргей ШЫЧКО**

# НА ПРЫПЫНКУ З КОЛАСАМ І БАГДАНОВІЧАМ

**У пінскім рэкламным агенцтве «Аранжавы дэльфін», якое займаецца афармленнем прыпынкаў, вырашылі зрабіць адзін з іх у цэнтры горада цалкам... культурным.**

У павільёне пад назвай «Плошча Кірава» з'явіліся плакаты з партрэтамі Івана Шамякіна, Максіма Багдановіча і Уладзіміра Мулявіна. Побач — стэнд з выявай гарадской канцэртнай залы. Пад кожным з партрэтаў змешчаны біяграфічныя даведкі дзеяча культуры. Сацыяльная рэклама такім чынам прадэманстравала асветніцкі характар. Яшчэ раней новы дызайн атрымаў прыпынак па вуліцы Цэнтральнай. Галерэя славутых дзеячаў нашай культуры пастаянна папаўняецца. Нядаўна на вуліцы Кірава з'явіліся партрэты тых, чые юбілеі адзначаюцца ў 2016 годзе, — Івана Мележа, Кандрата Крапівы, Алаізы Пашкевіч (Цёткі). Гэты год юбілейны і для Боны Сфорцы, якая атрымала Пінск у дар ад мужа караля Жыгімонта І. Аўтары ноу-хау нагадалі пінчукам і пра эпоху каралевы.

— Сацыяльная рэклама, прысвечаная Году культуры, неўзабаве з'явіцца яшчэ на 30 прыпынках і іншых пляцоўках горада, — паведаміў **намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пінскага гарвыканкама Анатоль ЛІПКО.**

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*




■ Да ўвагі

# НЕ КЛАДЗІЦЕ ГРОШЫ Ў ДАКУМЕНТЫ

**Ужо ў гэтым годзе на ўчастку адказнасці Брэсцкай памежнай групы 12 чалавек абвінавачаныя ў тым, што здавалі на праверку дакументы з укладзенымі купюрамі.**

Такія інцыдэнты здараліся на пунктах пропуску «Брэст» і «Дамачава». Ва ўсіх выпадках грамадзяне тлумачылі, што грошы забыліся ў пашпартах выпадкова. Але цяпер гэта разглядаецца як падбухторванне да парушэння парадку праходжання памежнага кантролю. Так што не забывайцеся ў дакументах грошы! Бо, напрыклад, 9 з 12 грамадзян суседняй краіны ў якасці пакарання атрымалі дэпартацыю і забарону на ўезд да нас на тэрмін ад аднаго да пяці гадоў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

## РАШЭННЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА

# АБ СТАНЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЦІ

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П.П., намесніка Старшыні Сяргеевай В.Г., суддзяў Бойка Т.С., Варановіча Т.В., Данілюка С.Я., Ізоткі У.П., Карповіч Н.А., Козыравай Л.Р., Падгрушы В.В., Рабцава Л.М., Цікавенкі А.Г., Чыгрынава С.П., разгледзеўшы ў судовым пасяджэнні пытанне аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2015 годзе,

кіруючыся артыкуламі 22 і 24 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, артыкуламі 12, 74, 79, 84, 161—163 Закона Рэспублікі Беларусь «О конституционном судопроизводстве»,

**ВЫРАШЫЎ:**

1. Прыняць Пасланне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і палатам Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2015 годзе» (дадаецца).

2. Апублікаваць Пасланне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і палатам Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2015 годзе» ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

**Старшынствуючы — Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь П.П. МІКЛАШЭВІЧ.**

*№ Р-1028/2016*

**Прэзідэнту
Рэспублікі Беларусь**

**Палаце прадстаўнікоў
Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь**

**Савету Рэспублікі
Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь**

Найважнейшай юрыдычнай формай выяўлення грамадскай згоды, адзінства народа выступае Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, якая ўстанаўлівае асновы канстытуцыйнага ладу, фундаментальныя прынцыпы арганізацыі і функцыянавання беларускага грамадства і дзяржавы.

Рэалізуючы канстытуцыйныя палажэнні аб народным і дзяржаўным суверэнітэце, беларускі народ як адзіная крыніца дзяржаўнай улады і носьбіт суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь на мінулых выбарах дэмакратычным шляхам выбраў Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнку, пацвердзіў сваё імкненне захаваць дасягнутую грамадскую згоду і стабільнасць, забяспечваць паслядоўнае і дынамічнае развіццё грамадства і дзяржавы на канстытуцыйнай аснове.

Канстытуцыя з'яўляецца асновай прававой сістэмы, яе нормы, якія валодаюць устаноўчым характарам і непасрэдным дзеяннем, развіваюцца па сутнасці і атрымліваюць рэальнае ўвасабленне ў заканадаўстве і правапрымяненні.

Дзейнасць Канстытуцыйнага Суда як органа канстытуцыйнага кантролю ў мінулым годзе была накіравана на абарону канстытуцыйнага ладу, гарантаваных Канстытуцыяй правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, забеспячэнне вяршэнства Канстытуцыі, зацвярджэнне канстытуцыйнай законнасці ў нарматворчасці і правапрымяненні.

### I

Ажыццяўленне Канстытуцыйным Судом на падставе Канстытуцыі, Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў і Закона Рэспублікі Беларусь «О конституционном судопроизводстве» паўнамоцтваў па правядзенні абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці законаў, прынятых Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца найважнейшым спосабам абароны Канстытуцыі юрыдычнымі сродкамі, які падразумявае выяўленне неканстытуцыйных норм і спыненне іх дзеяння, устараненне прабелаў канстытуцыйна-прававога рэгулявання.

Канстытуцыйны Суд у 2015 годзе ў парадку ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю праверыў канстытуцыйнасць 50 законаў, прынятых Парламентам. Пры праверцы канстытуцыйнасці законаў Канстытуцыйны Суд зыходзіў з вяршэнства Канстытуцыі і неабходнасці абароны асноў канстытуцыйнага ладу, накіраванасці заканадаўчых механізмаў на павышэнне ўзроўню забяспечанасці і бяспекі прававога рэгулявання рэалізацыі і гарантый абароны правоў і свабод чалавека як найвышэйшай каштоўнасці і мэты грамадства і дзяржавы.

1. У рашэннях, прынятых па выніках ацэнкі канстытуцыйнасці законаў, Канстытуцыйны Суд фармуляваў прававыя пазіцыі, у якіх канстатаваў ажыццяўленне канстытуцыяналізацыі грамадскіх адносін у розных сферах, замацаванне ў законах механізмаў рэалізацыі канстытуцыйных прынцыпаў і норм.

1.1. Згодна з Канстытуцыяй прадстаўнічым і заканадаўчым органам Рэспублікі Беларусь з'яўляецца Парламент — Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь, які выступае прадстаўнічай формай рэалізацыі народаўладдзя. Ажыццяўляючы канстытуцыйныя паўнамоцтвы па заканадаўчым рэгуляванні найважнейшых грамадскіх адносін, Нацыянальны сход стварае прававую базу для развіцця ўсіх сфер жыццядзейнасці грамадства і дзяржавы. Заканатворчую работу па падрыхтоўцы і прыняцці законаў Парламент ажыццяўляе ў рамках Канстытуцыі і Закона Рэспублікі Беларусь «О Национальном собрании Республики Беларусь».

У рашэнні ад 25 мая 2015 г. «О соответствии Конституции Республики Беларусь Закона Республики Беларусь «О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «О Национальном собрании Республики Беларусь» Канстытуцыйны Суд указаў, што мэтам рэалізацыі канстытуцыйна-прававога статусу Нацыянальнага сходу адпавядаюць змяненні і дапаўненні, якія ўносяцца ў Закон «О Национальном собрании Республики Беларусь», звязаныя з падрыхтоўкай і прыняццем законаў. Так, удакладняецца парадак разгляду палатамі Нацыянальнага сходу закона, вернутага Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь з пярэчаннямі. Пры гэтым апрача рашэння аб дапрацоўцы праекта закона з улікам пярэчанняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якое можа быць прынята Палатай прадстаўнікоў, замацоўваецца магчымасць прыняцця рашэння аб адхіленні праекта закона, калі такая прапанова ўносілася.

Канстытуцыйны Суд адзначыў, што гэтае ўдакладненне садзейнічае рэалізацыі функцыі Парламента ў сістэме раздзялення ўлад — прыняцце законаў, якія забяспечваюць належнае прававое рэгуляванне найбольш важных грамадскіх адносін, што адказваюць патрэбнасцям грамадства і дзяржавы, а таксама развіццю механізмаў і форм узаемадзеяння Парламента з іншымі ўдзельнікамі заканадаўчага працэсу. Указаныя нормы Закона адпавядаюць таксама канстытуцыйным прынцыпам вяршэнства права і заснаванаму на ім прынцыпу прававой вызначанасці, паколькі канкрэтызуюць магчымыя прававыя вынікі непадпісання закона Прэзідэнтам, замацоўваюць паўнамоцтвы Палаты прадстаўнікоў па вызначэнні такіх вынікаў у дачыненні да законапраекта, дапрацоўка якога прызнана немэтазгоднай.

Ажыццяўляючы праверку канстытуцыйнасці Закона Рэспублікі Беларусь «О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «Об утверждении Основных направлений внутренней и внешней политики Республики Беларусь», у рашэнні ад 27 мая 2015 г. Канстытуцыйны Суд звярнуў увагу на тое, што да асноўных напрамкаў у сферы міжнароднай бяспекі адносіцца процідзеянне незаконнаму распаўсюджванню зброі масавага паражэння, сродкаў яе дастаўкі, тэхналогій стварэння зброі масавага паражэння і сродкаў яе дастаўкі, а таксама ажыццяўленне экспартнага кантролю.

Канстытуцыйным Судом адзначана, што пры ажыццяўленні ўнутранай і знешняй палітыкі ў сферы бяспекі Рэспубліка Беларусь будзе процідзейнічаць і незаконнаму распаўсюджванню тэхналогій стварэння зброі масавага паражэння і сродкаў яе дастаўкі, што накіравана на недапушчэнне незаконнай вытворчасці ў замежных дзяржавах комплексаў узбраенняў вялікай паражаючай здольнасці. Указаныя палажэнні Закона «Об утверждении Основных направлений внутренней и внешней политики Республики Беларусь» адпавядаюць частцы першай артыкула 18 Канстытуцыі, якая ўстанаўлівае, што Рэспубліка Беларусь у сваёй знешняй палітыцы зыходзіць у тым ліку з прынцыпаў непрымянення сілы або пагрозы сілай, мірнага ўрэгулявання спрэчак, а таксама адказваюць такой мэце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, як падтрыманне міжнароднага міру і бяспекі (пункт 1 артыкула 1 Статута ААН).

Пры праверцы канстытуцыйнасці Закона Рэспублікі Беларусь «О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «О гражданстве Республики Беларусь» Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 16 снежня 2015 г. указаў, што грамадзянства — канстытуцыйна-прававы інстытут, які ўяўляе сабой канстытуцыйна-прававое рэгуляванне асобай палітыка-прававой сувязі грамадзяніна і Рэспублікі Беларусь, што абумоўлівае аб'ём узаемных правоў і абавязкаў, сукупнасць якіх складае палітыка-прававы статус грамадзяніна. Грамадзянства мае экстэрытарыяльны, устойлівы і свабодны характар, пры гэтым дзяржава гарантуе грамадзяніну абарону і заступніцтва як на тэрыторыі Беларусі, так і за яе межамі, а грамадзянін не можа быць пазбаўлены грамадзянства Рэспублікі Беларусь або права змяніць грамадзянства.

Ацэньваючы канстытуцыйнасць парадку і ўмоў набыцця грамадзянства Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжваюцца правяраемым Законам, Канстытуцыйны Суд у рашэнні выклаў прававую пазіцыю, згодна з якой, зыходзячы з вяршэнства Канстытуцыі, суверэннае права Рэспублікі Беларусь ажыццяўляць прававое рэгуляванне адносін, звязаных з грамадзянствам, падразумявае магчымасць меркавання заканадаўца пры ўстанаўленні прынцыпаў, падстаў, умоў, парадку набыцця і спынення грамадзянства Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым вызначальным для развіцця інстытута грамадзянства з'яўляецца канстытуцыйны прынцып вяршэнства права, які падразумявае, што прававое рэгуляванне ў гэтай сферы павінна грунтавацца на палажэннях Канстытуцыі і ўзгадняцца з агульнапрызнанымі прынцыпамі міжнароднага права і міжнароднымі абавязацельствамі Рэспублікі Беларусь.

1.2. Канстытуцыя абвяшчае Рэспубліку Беларусь сацыяльнай прававой дзяржавай, палітыка якой накіравана на стварэнне ўмоў для свабоднага і годнага развіцця асобы, забеспячэння годнага ўзроўню жыцця (частка першая артыкула 1, частка другая артыкула 2, частка другая артыкула 21). Сацыяльная дзяржава, з аднаго боку, забяспечвае рост дабрабыту грамадзян, паляпшэнне іх жыцця, задавальненне матэрыяльных і духоўных патрэбнасцей, а з другога — садзейнічае развіццю эканамічнай актыўнасці грамадзян, пераадоленню ўтрыманскіх настрояў у сацыяльнай сферы.

У шэрагу рашэнняў, вынесеных у парадку ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці законаў, Канстытуцыйны Суд фармуляваў прававыя пазіцыі, накіраваныя на раскрыццё ў законах сутнасці прынцыпу сацыяльнай дзяржавы.

Правяраючы канстытуцыйнасць Закона Рэспублікі Беларусь «О республиканском бюджете на 2016 год», Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 24 снежня 2015 г. адзначыў сацыяльную накіраванасць гэтага Закона ў частцы фінансавання расходаў на ахову здароўя, фізічную культуру і спорт, адукацыю, сацыяльную абарону сямей з дзецьмі, пенсіённае забеспячэнне, маладзёжную палітыку, дапамогу ў забеспячэнні жыллём і вырашэнне іншых пытанняў у галіне сацыяльнай палітыкі, што грунтуецца на нормах артыкулаў 32, 47 і 48 Канстытуцыі і адпавядае частцы першай артыкула 1 Канстытуцыі, згодна з якой Рэспубліка Беларусь з'яўляецца сацыяльнай дзяржавай.

Пры ацэнцы канстытуцыйнасці норм Закона Рэспублікі Беларусь «О бюджете государственного внебюджетного фонда социальной защиты населения Республики Беларусь на 2016 год» Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 24 снежня 2015 г. указаў, што вызначэнне названым Законам крыніц фарміравання даходаў бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2016 год, іх аб'ёму і напрамкаў выкарыстання сродкаў фонду мае на мэце забеспячэнне сацыяльнай абароны катэгорый насельніцтва, якія ў ёй адчуваюць патрэбу, і павышэнне эфектыўнасці дзяржаўнай палітыкі ў сацыяльнай сферы, адраснасці мер па сацыяльнай абароне насельніцтва, дасягненне балансу інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы.

1.3. У некаторых рашэннях Канстытуцыйны Суд выклаў прававыя пазіцыі, накіраваныя на выяўленне канстытуцыйна-прававога сэнсу палажэнняў разгледжаных законаў з пункту гледжання рэалізацыі канстытуцыйных норм, якія вызначаюць, што Рэспубліка Беларусь з'яўляецца прававой дзяржавай, валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі, самастойна ажыццяўляе ўнутраную і знешнюю палітыку, абараняе сваю незалежнасць і тэрытарыяльную цэласнасць, канстытуцыйны лад, забяспечвае законнасць і правапарадак.

Правяраючы канстытуцыйнасць Закона Рэспублікі Беларусь «О борьбе с коррупцией», Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 8 ліпеня 2015 г. прызнаў гэты Закон адпавядаючым Канстытуцыі. Пры гэтым адзначана, што адной з прававых асноў дзяржаўнай палітыкі ў сферы барацьбы з карупцыяй, разам з ускладаннем дадзенага абавязку на дзяржаўныя органы — органы пракуратуры, унутраных спраў і дзяржаўнай бяспекі, з'яўляецца грамадскі кантроль за дзейнасцю па барацьбе з карупцыяй. З гэтай мэтай у Законе «О борьбе с коррупцией» устанаўліваецца, што грамадскі кантроль у сферы барацьбы з карупцыяй ажыццяўляецца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, арганізацыямі, у тым ліку грамадскімі аб'яднаннямі, у парадку, вызначаным заканадаўчымі актамі, пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь; іх дзейнасць, звязаная з указаным грамадскім кантролем, можа ажыццяўляцца шляхам удзелу ў распрацоўцы і ўсенародным (грамадскім) абмеркаванні праектаў нарматыўных прававых актаў у сферы барацьбы з карупцыяй, у дзейнасці створаных у дзяржаўных органах і арганізацыях камісій па процідзеянні карупцыі, а таксама ў іншых формах, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

Нароўні з названымі формамі дзейнасць прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў, звязаная з грамадскім кантролем у сферы барацьбы з карупцыяй, можа ажыццяўляцца ў такіх формах, як правядзенне грамадскай экспертызы праектаў нарматыўных прававых актаў у сферы барацьбы з карупцыяй і накіраванне адпаведных заключэнняў у дзяржаўныя органы, якія ажыццяўляюць барацьбу з карупцыяй; удзел у пасяджэннях калегій дзяржаўных органаў, якія ажыццяўляюць барацьбу з карупцыяй, каардынацыйных нарад па барацьбе са злачыннасцю і карупцыяй з правам дарадчага голасу; работа па падрыхтоўцы праектаў нарматыўных прававых актаў, рашэнняў органаў выканаўчай улады і іншых дакументаў, што закранаюць правы і законныя інтарэсы грамадзян і арганізацый; удзел у правядзенні сацыялагічных апытанняў аб процідзеянні карупцыі.

Канстытуцыйны Суд ацаніў палажэнні названага Закона, якія прадугледжваюць прыцягненне грамадзян і арганізацый да ўдзелу ў вырашэнні дзяржаўных задач, з аднаго боку, як адну з дзейсных мер кансалідацыі ўсяго грамадства на ўзмацненне барацьбы з карупцыяй, а з другога — як меру, што спрыяе ўмацаванню даверу грамадзян да дзяржавы.

Атрыманне аб'ектыўнай своечасовай інфармацыі аб стане навакольнага асяроддзя з'яўляецца важнай умовай рэалізацыі грамадзянамі замацаванага часткай другой артыкула 37 Канстытуцыі права на непасрэдны ўдзел у кіраванні справамі грамадства і дзяржавы, якое забяспечваецца правядзеннем рэферэндумаў, абмеркаваннем праектаў законаў і пытанняў рэспубліканскага і мясцовага значэння, іншымі вызначанымі законам спосабамі.

Правяраючы на адпаведнасць Канстытуцыі Закон Рэспублікі Беларусь «О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «О животном мире», у рашэнні ад 16 снежня 2015 г. Канстытуцыйны Суд падкрэсліў, што на развіццё гэтага канстытуцыйнага палажэння накіраваны пункт 1 артыкула 13 Закона «О животном мире», які прадугледжвае, што грамадзяне маюць права ўдзельнічаць у вырашэнні пытанняў, звязаных з аховай і выкарыстаннем жывёльнага свету, праз рэферэндумы, сходы і іншыя формы прамога ўдзелу ў дзяржаўных і грамадскіх справах у адпаведнасці з заканадаўствам; упаўнаважаныя дзяржаўныя органы садзейнічаюць у адпаведнасці з заканадаўствам удзелу грамадзян у вырашэнні ўказаных пытанняў.

Канстытуцыйны Суд канстатуе станоўчую тэндэнцыю росту колькасці законаў, у якіх атрымлівае развіццё і больш поўную рэалізацыю права грамадзян на ўдзел у вырашэнні дзяржаўных спраў як непасрэдна, так і праз сваіх прадстаўнікоў.

1.4. Эканамічная аснова канстытуцыйнага ладу вызначана ў прынцыпах і нормах Канстытуцыі аб наданні дзяржавай усім роўных правоў для ажыццяўлення гаспадарчай і іншай дзейнасці, акрамя забароненай законам, гарантый роўнай абароны і роўных умоў для развіцця ўсіх форм уласнасці, роўных магчымасцей свабоднага выкарыстання здольнасцей і маёмасці для прадпрымальніцкай і іншай не забароненай законам эканамічнай дзейнасці; аб рэгуляванні эканамічнай дзейнасці ў інтарэсах чалавека і грамадства; аб забеспячэнні накіравання і каардынацыі дзяржаўнай і прыватнай эканамічнай дзейнасці ў сацыяльных мэтах.

Пры ажыццяўленні абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці законаў у шэрагу рашэнняў Канстытуцыйны Суд адзначаў, што прынятыя законы накіраваны на павышэнне ўзроўню прававой забяспечанасці ў эканамічнай сферы.

У рашэнні ад 30 чэрвеня 2015 г. «О соответствии Конституции Республики Беларусь Закона Республики Беларусь «О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «О товарных биржах» Канстытуцыйны Суд указаў, што ў мэтах выключэння дзеянняў удзельнікаў біржавога гандлю па штучным завышэнні або заніжэнні цэн на біржавыя тавары (маніпуліраванне цэнамі) Законам «О товарных биржах» вызначаюцца ўмовы цэнаўтварэння ў біржавым гандлі, згодна з якімі адначасовае выстаўленне адным і тым жа ўдзельнікам біржавога гандлю заявак на рэалізацыю і набыццё біржавога тавару па цэнах, якія маюць істотнае адхіленне ад бягучых рыначных цэн на аналагічныя біржавыя тавары, з'яўляецца маніпуліраваннем цэнамі, што цягне прымяненне таварнай біржай мер, прадугледжаных правіламі біржавога гандлю. Гэтае прававое рэгуляванне адпавядае палажэнням артыкула 13 Канстытуцыі, мае на мэце недапушчэнне завышэння або заніжэння цэн на біржавыя тавары ўдзельнікамі біржавога гандлю, развіццё спрыяльнага канкурэнтнага асяроддзя на таварных рынках, абарону правоў і законных інтарэсаў асоб, якія займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю.

У гэтым жа рашэнні Канстытуцыйным Судом выказана пазіцыя аб тым, што ўстанаўленне магчымасці ўдзелу замежных і міжнародных юрыдычных асоб (арганізацый, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі) у біржавых таргах у якасці біржавых брокераў, нароўні з юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, зарэгістраванымі ў Рэспубліцы Беларусь, накіравана на ўстараненне бар'ераў і абмежаванняў узаемнага доступу суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці на рынкі дзяржаў — членаў Еўразійскага эканамічнага саюза і тым самым на рэалізацыю імі права на свабоднае выкарыстанне сваіх здольнасцей і маёмасці для прадпрымальніцкай і іншай не забароненай законам эканамічнай дзейнасці.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што прыняцце названага Закона, а таксама рост колькасці нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць розныя аспекты гандлю, уключаючы біржавы, сведчаць аб неабходнасці комплекснай распрацоўкі такой падгаліны грамадзянскага права, як гандлёвае права, ва ўмовах глабалізацыі эканомікі і эканамічнай інтэграцыі на еўразійскай прасторы.

У рашэнні ад 7 ліпеня 2015 г. Канстытуцыйны Суд звярнуў увагу на тое, што Закон Рэспублікі Беларусь «О хозяйственных обществах» дапаўняецца нормай, згодна з якой палажэнні гэтага Закона, што рэгламентуюць прававое палажэнне, парадак стварэння, дзейнасці, рэарганізацыі і ліквідацыі гаспадарчых таварыстваў, распаўсюджваюцца на гаспадарчыя таварыствы, якія складаюцца з аднаго ўдзельніка, калі іншае не прадугледжана гэтым Законам і іншымі заканадаўчымі актамі. Адначасова ўстанаўліваецца, што гаспадарчае таварыства можа быць заснавана адной асобай або складацца з аднаго ўдзельніка, у тым ліку пры стварэнні ў выніку рэарганізацыі юрыдычнай асобы.

Пры ацэнцы канстытуцыйнасці дапаўненняў, якія ўносяцца ў названы Закон, Канстытуцыйны Суд адзначыў, што такое прававое рэгуляванне грунтуецца на канстытуцыйных палажэннях аб гарантаванасці ўсім роўных магчымасцей свабоднага выкарыстання здольнасцей і маёмасці для прадпрымальніцкай і іншай не забароненай законам эканамічнай дзейнасці і аб ажыццяўленні рэгулявання эканамічнай дзейнасці ў інтарэсах чалавека і грамадства. Замацаванне магчымасці функцыянавання гаспадарчых таварыстваў з адным удзельнікам накіравана на стварэнне больш спрыяльных умоў для ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, дасягненне мэт канстытуцыйнай эканомікі, забеспячэнне балансу інтарэсаў гаспадарчага таварыства і яго заснавальніка (удзельніка), дзяржавы, а таксама абарону гэтых інтарэсаў.

Правяраючы канстытуцыйнасць Закона Рэспублікі Беларусь «О государственно-частном партнерстве», Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 24 снежня 2015 г. адзначыў накіраванасць гэтага Закона на далейшае развіццё канстытуцыйных палажэнняў аб наданні дзяржавай усім роўных правоў для ажыццяўлення гаспадарчай і іншай дзейнасці, а таксама аб гарантаванні роўных магчымасцей свабоднага выкарыстання здольнасцей і маёмасці для прадпрымальніцкай дзейнасці шляхам заканадаўчага замацавання механізма дзяржаўна-прыватнага партнёрства, які ўстанаўлівае дадатковыя формы і парадак ажыццяўлення адпаведных відаў дзейнасці і прыцягнення інвестыцый у эканоміку краіны з мэтай стварэння ўмоў для забеспячэння ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця і нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Ацэнка канстытуцыйнасці законаў эканамічнага зместу ў парадку ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю законаў сведчыць, што ў Рэспубліцы Беларусь ідзе працэс стварэння ўмоў і механізмаў прававой забяспечанасці і бяспекі канстытуцыйнай эканомікі як найважнейшага складніка прававой сацыяльнай дзяржавы.

1.5. Прававая дзяржава характарызуецца самастойнай і незалежнай судовай уладай, якая эфектыўна забяспечвае абарону правоў і свабод грамадзян, правоў і законных інтарэсаў юрыдычных асоб.

Функцыянаванне судовай сістэмы накіравана на абарону непахіснасці канстытуцыйнага ладу, ахову правапарадку, маёмасных і немаёмасных правоў, законных інтарэсаў грамадзян і юрыдычных асоб, а таксама гарантаванне свабоды эканамічнай дзейнасці.

Раскрываючы ў сваіх рашэннях канстытуцыйны змест права на судовую абарону, Канстытуцыйны Суд зыходзіць з норм Канстытуцыі, у адпаведнасці з якімі чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы; кожнаму гарантуецца абарона яго правоў і свабод кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом у вызначаныя законам тэрміны (артыкулы 2 і 60).

Гарантыяй належнага забеспячэння канстытуцыйнага права на судовую абарону выступаюць устаноўленыя ў крымінальным судаводстве працэдуры праверкі судовых рашэнняў судамі вышэйстаячых інстанцый і падставы для адмены або змянення судовых рашэнняў.

На аснове аналізу новай рэдакцыі раздзела X Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей — КПК), якая прадугледжвае ўвядзенне ў крымінальны працэс апеляцыйнага вядзення, Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 29 снежня 2015 г. «О соответствии Конституции Республики Беларусь Закона Республики Беларусь «О внесении изменений и дополнений в некоторые кодексы Республики Беларусь» адзначыў, што ў нормах крымінальна-працэсуальнага закона, згодна з якімі прыгавор суда першай інстанцыі, што не ўступіў у законную сілу, маюць права абскардзіць у апеляцыйным парадку ўсе асобы, чые правы і законныя інтарэсы парушаны пастаноўленым па крымінальнай справе судовым рашэннем, і ў той частцы, у якой прыгавор закранае іх інтарэсы, рэалізуецца заснаваны на частцы трэцяй артыкула 115 Канстытуцыі прынцып свабоды абскарджання рашэнняў, прыгавораў і іншых судовых пастаноў.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што ўвядзенне ў крымінальны працэс стадыі перагляду прыгавораў, якія не ўступілі ў законную сілу, вызначэнняў, пастаноў у апеляцыйным парадку накіравана на гарантаванне законнасці, абгрунтаванасці і справядлівасці судовых пастаноў па крымінальных справах, забеспячэнне празрыстасці судовых працэдур, фарміраванне аднастайнай судовай практыкі, павышэнне аператыўнасці і эканамічнасці судовай дзейнасці.

Пры праверцы канстытуцыйнасці Закона Рэспублікі Беларусь «Об оперативно-розыскной деятельности» Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 8 ліпеня 2015 г. адзначыў, што названым Законам замацоўваецца права грамадзян, у дачыненні да якіх праводзяцца або праводзіліся аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы, грамадзян, прыцягнутых органамі, якія ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць, да падрыхтоўкі правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў і (або) удзелу ў іх, а таксама арганізацый у сувязі з ажыццяўленнем аператыўна-вышуковай дзейнасці абскардзіць дзеянні органаў, якія ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць, у вышэйстаячыя органы, якія ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць, пракурору або ў суд у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі. Гэта азначае, што любая асоба, якая лічыць, што пры правядзенні аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў парушаны або абмежаваны яе правы, свабоды і законныя інтарэсы, можа выбраць па сваім меркаванні спосаб іх юрыдычнай абароны.

Па меркаванні Канстытуцыйнага Суда, расшырэнне заканадаўцам сферы судовага абскарджання грамадзянамі дзеянняў розных дзяржаўных органаў аб'ектыўна абумоўлівае неабходнасць паглыблення спецыялізацыі ў судовай сістэме шляхам вылучэння адміністрацыйнага судаводства ў якасці асобнага складніка судаводства.

У рашэнні ад 8 ліпеня 2015 г. «О соответствии Конституции Республики Беларусь Закона Республики Беларусь «О Государственном комитете судебных экспертиз Республики Беларусь» Канстытуцыйны Суд адзначыў, што па сваім змесце Закон накіраваны на ўстанаўленне прававых і арганізацыйных асноў дзейнасці Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь, рэалізацыю адзінай дзяржаўнай палітыкі ў сферы судова-экспертнай дзейнасці з мэтай гарантавання абароны канстытуцыйных правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян.

Указанае заканадаўчае рэгуляванне, якое прадугледжвае правядзенне судовых экспертыз, экспертыз (даследаванняў) па матэрыялах дзяржаўных органаў, а таксама экспертыз па зваротах грамадзян і юрыдычных асоб, накіравана, з аднаго боку, на забеспячэнне выканання дзяржаўнымі органамі і службовымі асобамі канстытуцыйнага абавязку па прыняцці неабходных мер для ажыццяўлення і абароны правоў і свабод асобы, а з другога — на рэалізацыю канстытуцыйнага прынцыпу ажыццяўлення правасуддзя на аснове спаборнасці і роўнасці бакоў у працэсе.

Такім чынам, у прававых пазіцыях, выпрацаваных на аснове палажэнняў Канстытуцыі і забеспячэння яе вяршэнства, усведамляўся канстытуцыйна-прававы змест норм законаў з улікам неабходнасці дасягнення балансу канстытуцыйных каштоўнасцей і прынцыпаў вяршэнства права, законнасці і прававой вызначанасці.

2. Канстытуцыйныя прынцыпы прававой дзяржавы, заснаваныя на вяршэнстве права, падразумяваюць абавязак дзяржавы прызнаваць, выконваць і абараняць правы і свабоды чалавека і грамадзяніна.

У мэтах абароны канстытуцыйных каштоўнасцей у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маралі, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб Канстытуцыяй дапускаецца абмежаванне правоў і свабод чалавека і грамадзяніна.

Канстытуцыйны Суд у сваіх рашэннях неаднаразова падкрэсліваў, што прававыя абмежаванні павінны забяспечваць баланс паміж канстытуцыйнымі правамі і свабодамі грамадзян і публічнымі інтарэсамі дзяржавы і грамадства. Любыя абмежаванні канстытуцыйных правоў і свабод павінны быць не толькі юрыдычна дапушчальнымі, сацыяльна апраўданымі, але і справядлівымі, неабходнымі і суразмернымі з канстытуцыйна прызнаваемымі мэтамі такіх абмежаванняў.

Так, ацэньваючы канстытуцыйнасць абмежаванняў, звязаных з ажыццяўленнем банкаўскіх аперацый, Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 27 мая 2015 г. «О соответствии Конституции Республики Беларусь Закона Республики Беларусь «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь» указаў, што згодна са змяненнем, якое ўносіцца ў Банкаўскі кодэкс Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь, банкі і нябанкаўскія крэдытна-фінансавыя арганізацыі абмяжоўваюць правядзенне банкаўскіх аперацый у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь аб прадухіленні легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці і фінансавання распаўсюджвання зброі масавага паражэння.

Пры праверцы канстытуцыйнасці гэтага палажэння Канстытуцыйны Суд пацвердзіў выказаную ім у шэрагу раней прынятых рашэнняў прававую пазіцыю, сутнасць якой заключаецца ў тым, што нормы аб адмове або прыпыненні фінансавай аперацыі ў пэўнай меры абмяжоўваюць канстытуцыйнае права ўласнасці (артыкулы 13 і 44 Канстытуцыі). Разам з тым, зыходзячы са зместу часткі першай артыкула 23 Канстытуцыі, якая дапускае абмежаванне правоў і свабод асобы, ва ўзаемасувязі з палажэннем часткі шостай артыкула 44 Канстытуцыі, якое прадугледжвае, што ажыццяўленне права ўласнасці не павінна супярэчыць грамадскай карысці і бяспецы, ушчамляць правы і абараняемыя законам інтарэсы іншых асоб, Канстытуцыйны Суд зрабіў вывад, што права ўласнасці можа быць абмежавана заканадаўцам у адпаведнасці з агульнаправавым прынцыпам прапарцыянальнасці ў той меры, у якой гэта неабходна для дасягнення канстытуцыйна значных мэт.

Па меркаванні Канстытуцыйнага Суда, адмова ўдзельнікам фінансавай аперацыі ў яе ажыццяўленні, а роўна прыпыненне яе ажыццяўлення ў выпадку адпаведнасці крытэрыям выяўлення і прыкметам падазронай фінансавай аперацыі закранаюць канстытуцыйнае права ўласнасці ўдзельнікаў фінансавай аперацыі, аднак з'яўляюцца правамернымі, паколькі прадугледжаны законам і адпавядаюць патрабаванням суразмернасці і дапушчальнасці. Устанаўліваючы падобныя абмежаванні, заканадавец стварае прававы механізм для прадухілення легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці і фінансавання распаўсюджвання зброі масавага паражэння, што адпавядае інтарэсам нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны правоў і свабод іншых асоб.

У рашэнні ад 30 чэрвеня 2015 г. «О соответствии Конституции Республики Беларусь Закона Республики Беларусь «О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «О рекламе» Канстытуцыйны Суд указаў, што ўводзімая гэтым Законам забарона на размяшчэнне (распаўсюджванне) рэкламы алкагольных напояў і тытунёвых вырабаў пад выглядам рэкламы іншага тавару (прадукцыі, работ, паслуг), найменне арганізацыі і імені грамадзяніна цягне абмежаванне правоў адпаведных суб'ектаў рэкламнай дзейнасці.

Разам з тым згодна з часткай першай артыкула 45 Канстытуцыі грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права на ахову здароўя, уключаючы бясплатнае лячэнне ў дзяржаўных установах аховы здароўя.

Для забеспячэння аховы здароўя грамадзян Законам «О рекламе» вызначаюцца меры, звязаныя з абаронай цяперашняга і будучых пакаленняў ад разбуральных наступстваў для здароўя людзей, а таксама сацыяльных, экалагічных і эканамічных вынікаў спажывання алкаголю, тытуню і ўздзеяння тытунёвага дыму. Канстытуцыйны Суд указаў у рашэнні, што такое прававое рэгуляванне мае на мэце недапушчэнне злоўжыванняў з боку суб'ектаў гаспадарання, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць з таварамі, выявы таварных знакаў якіх падобныя да іншых; размяшчэнне алкагольных і тытунёвых брэндаў у рэкламе іншых тавараў, іншых паслуг; распаўсюджванне сярод насельніцтва інфармацыі, якая якім-небудзь чынам прыцягвае ўвагу да алкагольнай прадукцыі і тытунёвых вырабаў, і накіравана на дасягненне канстытуцыйна значных мэт, звязаных з забеспячэннем здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб; пры гэтым устанаўліваемыя абмежаванні суразмерныя з гэтымі мэтамі і не скажаюць сутнасці канстытуцыйных правоў грамадзян, а таксама гарантый ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці ў галіне рэкламы.

Пры праверцы канстытуцыйнасці норм Лясного кодэкса Рэспублікі Беларусь, які замацоўвае асновы арганізацыі лясной гаспадаркі, Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 18 снежня 2015 г. выклаў прававую пазіцыю зыходзячы з палажэнняў Канстытуцыі аб рэгуляванні дзяржавай эканамічнай дзейнасці ў інтарэсах чалавека і грамадства, аб забеспячэнні накіравання і каардынацыі дзяржаўнай і прыватнай эканамічнай дзейнасці ў сацыяльных мэтах ва ўзаемасувязі з палажэннямі аб паўнамоцтвах Парламента. З аналізу гэтых канстытуцыйных палажэнняў вынікае, што дзяленне лясоў на катэгорыі, умовы і парадак аднясення лясоў да катэгорый, перавод лясоў з адной катэгорыі ў другую, рэжым лесакарыстання ў залежнасці ад катэгорыі лясоў, у тым ліку пры ажыццяўленні эканамічнай дзейнасці, мае права вызначыць заканадавец. Пры гэтым у сілу наяўнай у яго дыскрэцыі заканадавец мае права ўлічыць як доўгатэрміновы характар пераўтварэння, узнаўлення і назапашвання лясных рэсурсаў, неабходнасць іх рацыянальнага выкарыстання, аховы і абароны лесу як састаўной часткі асяроддзя пражывання чалавека, так і іншыя акалічнасці сацыяльнага і эканамічнага характару.

Рэалізуючы паўнамоцтвы па ажыццяўленні абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці законаў, Канстытуцыйны Суд фармулюе прававыя пазіцыі на аснове выяўленага канстытуцыйна-прававога сэнсу норм законаў, вызначае межы меркавання заканадаўца ў заканатворчым працэсе.

Канстытуцыйны Суд адзначае, што Канстытуцыя надае заканадаўцу дастаткова шырокія дыскрэцыйныя паўнамоцтвы, гэта значыць магчымасць меркавання, «прастору выбару» ў рэгуляванні канкрэтных грамадскіх адносін, вызначэнні асаблівасцей прававога рэгулявання, устанаўленні, змяненні і абмежаванні суб'ектыўных правоў, умоў і механізмаў іх рэалізацыі. Аднак пры рэалізацыі сваіх паўнамоцтваў заканадавец дзейнічае ў межах, вызначаных канстытуцыйнымі прынцыпамі і нормамі, пры гэтым ён павінен улічваць неабходнасць падтрымання балансу і суразмернасці з канстытуцыйна абараняемымі каштоўнасцямі, мэтамі і інтарэсамі, якія знаходзяцца ў адзінстве, і не дапускаць падмены адной каштоўнасці другой або іх прымяншэння.

3. Вяршэнства Канстытуцыі ў дзяржаўным і грамадскім жыцці падразумявае няўхільнае выкананне дзяржавай, усімі яе органамі і службовымі асобамі, а таксама грамадзянамі і арганізацыямі прадпісанняў Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёй актаў заканадаўства, што, у сваю чаргу, стварае неабходныя перадумовы забеспячэння ў дзяржаве належнага ўзроўню канстытуцыйнай законнасці. У шэрагу рашэнняў, вынесеных у парадку ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці законаў, Канстытуцыйны Суд, зыходзячы з прынцыпаў і норм Канстытуцыі, фармуляваў прававыя пазіцыі, накіраваныя на выяўленне канстытуцыйна-прававога сэнсу норм законаў, для недапушчэння неканстытуцыйнай правапрымяняльнай практыкі.

